В результате анализа сложных причастий в Библии Лютера можно сделать некоторые выводы. Прежде всего, сложные причастия являются хоть и зарождающимся, но достаточно продуктивным образованием, о чем свидетельствуют количественные данные. Самой продуктивной в данном священном писании является модель, первый компонент которой представлен существительным, она составляет 63% от общего количества извлеченных из текста сложных причастий. Второй по количеству извлеченных из текста сложнопричастных образований является группа, первый компонент которой представлен числительным. Данная группа составляет 24% от общего количества сложных причастий анализируемого текста. Весьма немногочисленными по количеству причастных единиц являются группы сложных причастий с первым компонентом – наречием (6%) и местоимением (5%). Самой немногочисленной группой сложных причастий в Библии Лютера является группа сложных причастий, первый компонент которой выражен прилагательным (2%). Несмотря на невысокую количественную представленность, причастия последних трех групп являются интересным для анализа материалом, поскольку большинство сложных слов данного типа впервые появляется именно у Лютера.

Список использованных источников

1. Breckle, H. E. Generative Satzsemantik u. Transformationelle Syntax im System der englischen Nominalkomposition / H. E. Breckle. – München: Wilhelm Fink Verlag, 1976. – 220 s.

2. Степанова, М. Д. Словообразование современного немецкого языка / М. Д. Степанова. – М.: Изд. лит. на иностр. яз., 1953. – 375 с.

3. Степанова, М. Д. Словосложение в современном немецком языке: автореф. дис. … д-ра филол. наук / М. Д. Степанова. – Л., 1960. – 43 с.

4. Грушевая, И. С. Функционально-стилистические свойства сложнопричастных образований в современном немецком языке: дис. … канд. филол. наук: 10.02.04 / И. С. Грушевая. – Минск, 1982. – 209 л.

5. Brinkmann, H. B. Die Zusammensetzung im Deutschen / H. B. Brinkmann. – In. Sprachforum, 1956. – 231 s.

6. Luther, M. Biblia / M. Luther // Die heilige Schrift. Text derunrevidierten Lutherbibel 1545 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://enominepatris.com/biblia/biblia2/. – Дата доступа: 08.01.2016.

7. Москальская, О. И. История немецкого языка : учеб. для ин-тов и фак. иностр. яз. / О. И. Москальская. – М. : Высш. школа, 1977. – 277 с.

8. Mittelhoch deutsches Wörterbuch* [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.mhdwb-online.de/wb.php. – Дата доступа: 10.08.2015.

9. Mittelhoch deutsches Handwörterbuch von Matthias Lexer [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://woerterbuchnetz.de/NLexer. – Дата доступа: 12.12.2015.

10. Beate, H. Kleines mittelhochdeutsches Wörterbuch / H. Beate. – Tübingen: Max Niemeyer Verlag, 2007. – 499 s.

11. Дворецкий, И. Х. Древнегреческо-русский словарь / И. Х. Дворецкий. – Т. 1. – М.: ГИС, 1958. – 1043 с.

12. Дворецкий, И. Х. Древнегреческо-русский словарь / И. Х. Дворецкий. – Т. 2. – М.: ГИС, 1958. – 860 с.

13. Thayer, J. H. Greek-english lexicon of the New Testament / J. H. Thayer. – NewYork, Cincinnati, Chicago: AmericanBookCompany, 1886. – 775 p.

14. Большой немецко-русский словарь / К. Лейн [и др.]; 3-е изд. стереотип. – М.: Рус. яз. – Медиа, 2006. – 1038 с.

15. The Greek New Testament / K. Aland [et al.] ; ed.: III. – Stuttgard: United Bible Societies, 1983. – 926 p.

16. Rahlfs, A. Septuaginta / A. Rahlfs. – Stuttgart: Deutsche Biebelgesellschaft, 1979. – 941 s.

References

1. Breckle H. E., Generative Satzsemantik u. Transformationelle Syntax im System der englischen Nominalkomposition, Wilhelm Fink Verlag, München, DE, 1976.

2. Stepanova M. D., Slovoobrazovanie sovremennogo nemetskogo iazyka [Word-formation in Contemporary German], Izdatel'stvo literatury na inostrannykh iazykakh, Moscow, RU, 1953.

3. Stepanova M. D., “Compounding in Contemporary German”, Abstract of D. Sc. Dissertation, Germanic languages, Leningrad State University named after A.A. Zhdanov, Leningrad, RU, 1960.

4. Grushevaia I. S., “Functional and Stylistic Properties of Compound Participles in Contemporary German”, Ph.D. Thesis, Germanic languages, Minsk State Pedagogical Institute of Foreign Languages, Minsk, BY, 1982.

5. Brinkmann H. B., “Die Zusammensetzung im Deutschen”, Sprachforum, Koln-Graz, DE, 1956/57, pp. 222–231.

6. Luther M., “Biblia, Die heilige Schrift. Text der unrevidierten Lutherbibel 1545”, available at: http://enominepatris.com/biblia/biblia2/, (Accessed 08.01.2016).

7. Moskal'skaia O. I., Istoriia nemetskogo iazyka : uchebnik dlia in-tov i fak. inostr. iaz. [A History of German: A Textbook for Institutes and Faculties of Foreign Languages], High school, Moscow, RU, 1977.

8. “Mittelhochdeutsches Wörterbuch”, available at: http://www.mhdwb-online.de/wb.php, (Accessed 10.08.2015).

9. “Mittelhochdeutsches Handwörterbuch von Matthias Lexer”, available at: http://woerterbuchnetz.de/NLexer, (Accessed 12.12.2015).

10. Beate H., Kleines mittelhochdeutsches Wörterbuch, Max Niemeyer Verlag, Tübingen, DE, 2007.

11. Dvoretskii I. Kh., Drevnegrechesko-russkii slovar', T. 1 [Ancient Greek-Russian Dictionary, Vol. 1], GIS, Moscow, RU, 1958.

12. Dvoretskii I. Kh., Drevnegrechesko-russkii slovar', T. 2 [Ancient Greek-Russian Dictionary, Vol. 2], GIS, Moscow, RU, 1958.

13. Thayer J. H., Greek-english lexicon of the New Testament, American Book Company, New York, Cincinnati, Chicago, US, 1886.

14. Lein K., Mal'tseva D. G., Bol'shoi nemetsko-russkii slovar' [Large German-Russian Dictionary], 13nd ed., Russkii Iazyk – Media, Moscow, RU, 2006.

15. Aland K., Black A., Martini C. M., Metzger B. M., Wikgren A. (ed.), The Greek New Testament, 3nd ed., United Bible Societies, Stuttgard, DE, 1983.

16. Rahlfs A., Septuaginta, Deutsche Biebelgesellschaft, Stuttgard, DE, 1979.

Информация об авторе

Лобанова Татьяна Сергеевна – преподаватель немецкого языка. Белорусский государственный университет (ул. Карла Маркса, 31, 220030, Минск, Республика Беларусь). E-mail: Werdegang@mail.ru.

Information about the author

Lobanova Tatyana Sergeevna, Teacher of German, Belarusian State University (31 Karl Marx Str., Minsk 220030, Belarus). E-mail: Werdegang@mail.ru.

Для цитирования

Лобанова, Т. С. Сложнопричастные образования в Библии Лютера / Т. С. Лобанова // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 60–65.

For citation

Lobanova T. S. Compound Participles in the Luther Bible. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no.2, pp. 60–65.

ISSN 0321-1649 (print)
УДК 801.311:81-23

Паступіў у рэдакцыю 06.09.2016
Received 06.09.2016

А. І. Копач

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

СЕМІЯТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТАПОНІМАЎ: СІГМАТЫКА-ПРАГМАТЫЧНЫ ПОГЛЯД

Обоснована возможность изучения собственных имен с позиций сигматики – одного из аспектов плана содержания знака. Показана несводимость топонимов к одному четко заданному месту в семиотической классификации: исследователь может определить их символические, индексальные и иконические свойства. Причем рассмотрение топонимов как знаков-икон в приложении к именам разных видов объектов способно придать исследованию экспланаторный характер. Этапы изучения разных аспектов топознака (синтактика, семантика, прагматика) в целом повторяют этапы изучения слов общей лексики. Синтактика – простой, «осязаемый», а потому наиболее изученный аспект топознака. Семантика топонима оказывается условной (изучается семантика основ) в связи с наличием в структуре онима компонента уникальности, который не позволяет ему выражать понятие. В связи с поворотом науки к антропоцентризму в современной топонимике возникает новое направление, ориентированное на прагматику. На постсоветском пространстве оно исходит из необходимости изучать этнокультурные смыслы, которые стоят за элементами топонимов. Автор статьи предлагает при выявлении роли фактора человека исходить также из свойств объектов восприятия и их важности для людей в качестве ориентиров в пространстве, т. е. из сигматических характеристик. В результате выделяются четыре категоризационных шаблона, которые отражают как ключевые смыслы, представленные в топонимах, так и конструктивный характер построения системы имен.

Ключевые слова: топоним, семиотика, синтактика, семантика, прагматика, сигматика, представление об объекте, категориальное представление об объекте и его признаках.

A. I. Kopach

Belarusian State University, Minsk, Belarus

SEMIOTIC PECULIARITIES OF PLACE NAMES: A SIGMATIC AND PRAGMATIC VIEW

The article substantiates the possibility of studying place names from the viewpoint of sigmatics, an aspect of the content plane of a sign. The irreducibility of place names to one clearly specified place in semiotic classification is displayed: the researcher can define their symbolic, indexical, and iconic characteristics. Exploring toponyms as icons in application to names of various types of objects can put the study on the explanatory track. The stages of studying various aspects of place names (syntactics, semantics, and pragmatics) generally repeat the stages of studying common names. Syntactics is a simple, "tangible," and therefore the most studied aspect of a place name. The semantics of a place name appears to be conditional (stem semantics is explored) due to a unique component found in the structure of a toponym. This component prevents the place name from expressing a concept. Turning to anthropocentrism in science gave rise to a new trend in modern place names studies. The trend is focused on pragmatics. In the post-Soviet region, it is based on the need to explore ethnic and cultural meanings behind place name elements. The author proposes that, when detecting the role of the human factor, sigmatic properties should also be taken into account: properties of the perceived objects and their importance for people as reference points in spatial cognition. As a result, four categorization frames are distinguished which reflect both key senses reflected in place names, and the constructive character of creating the system of names.

Keywords: place name (toponym), semiotics, syntactics, semantics, pragmatics, sigmatics, idea of an object, categorical idea of an object and its characteristics.

Уводзіны. З мноства лінгвістычных знакаў, якія выкарыстоўваюцца ў соцыуме, імёны ўласныя належаць да той групы, якая нярэдка прылічаецца да непаўнавартасных. Калі ўласныя імёны і складалі аб'ект пільнай навуковай увагі з боку семіётыкі, то часцей за ўсё як знакі, якія сведчаць аб міфалагічным характары сувязі адзінкавых аб'ектаў з свядомасцю суб'екта [1, с. 61; 2, с. 110]. Ю. М. Лотман, у прыватнасці, адзначае, што ўласныя імёны – гэта «інкарпараваная ў тоўшчу натуральнай мовы некаторая іншая, інакш уладкаваная мова» [1, с. 62]. Такі падыход аўтаматычна накіроўвае ўсе онімы ў групу імёнаў з нематываванай сувяззю азначаючага і азначальнага, або знакаў-сімвалаў, паводле тэрміналогіі Ч. С. Пірса. Ён, аднак, не здымае шэраг пытанняў, якія тычацца прычын з'яўлення імёнаў, у прыватнасці тапонімаў. Ды і ў цэлым, звядзенне ўсіх знакаў толькі да сімвалаў не спрыяе іх тлумачэнню.

© Копач А. І., 2017

Як быццам «за кадрам» застаюцца запэўніванні логікаў і філосафаў мовы (Г. Фрэге, Б. Расэла, Д. Рудэнка і інш.), якія сцвярджаюць: «Няма падстаў думаць, што падчас выкарыстання ўласных імёнаў мы “адключаем” свядомасць» [3, с. 63 і інш.]. У гэтым жа кантэксце варта прывесці словы А. К. Матвеева: «адрыў уласных імёнаў ад апелятываў зусім бесперспектыўны як навуковы прынцып» [4, с. 20].

Думаецца, што прадузятасць думкі аб міфалагічнасці ўсіх уласных імёнаў абумоўлена тым фактам, які ўжо адзначаўся А. Л. Беразовіч, – «эталонным падыходам» першых анамастаў, які задаў каштоўнаснае стаўленне толькі да асобных класаў (назваў самых буйных аб’ектаў і імёнаў людзей) і мікрасістэм анімічнай лексікі [5, с. 41]. Відаць, толькі гэтым можна патлумачыць тое, што ў якасці прыкладаў, якія дазваляюць заўважыць міфалагічную сувязь імені з аб’ектам, звычайна бяруцца антрапонімы або назвы самых буйных, кансерватыўных аб’ектаў мясцовасці. «Я нічога не ведаю пра чалавека, калі я ведаю толькі тое, што яго завуць Якавам» – гэта фраза, якая стала класічным «доказам ад марксізму» няздольнасці онімаў абагульняць. Вынікам з’явіліся ўказанні лінгвістаў, у прыватнасці А. А. Уфімцавай, якая «пакарала» ўласнае імя далучэннем да ліку «дэфектыўных» [6, с. 42].

Незаўважаным у галіне тапанімнай лексікі засталося тое, што 1) мікратапонімы пэўнай мясцовасці па сваім колькасным складзе нашмат пераўзыходзяць любыя макратапонімы [5, с. 43], у той жа час мікратапонімы нашмат радзей страчваюць матываванасць у працэсе функцыянавання на мясцовасці; іх інфармацыйная каштоўнасць вышэй, чым у імёнаў буйных аб’ектаў [7, с. 30], а таму яны захоўваюць магчымасць быць інтэрпрэтаванымі; 2) у апелятыўнай лексіцы таксама існуе шэраг нематываваных адзінак з пункта гледжання сучаснага стану мовы; 3) словаўтварэнне ўяўляе сабой той прамежкавы пласт адзінак, які патэнцыяльна можа быць вывучаны не толькі з пазіцый лексікалогіі, але таксама з пункта гледжання сінтаксісу, прычым як фармальнага, так і актуальнага.

За гісторыка-генетычнымі пошукамі першых тапанімістаў, што ўстанаўліваюць моўную прыналежнасць даных асобных словаўтваральных гнёздаў, і працамі структуралістаў, якія не маюць выхаду на знешні свет і спрабуюць даказаць асаблівы статус анамастыкі праз пошук спецыялізаваных суфіксаў і прэфіксаў «незалежнай» аніміі, павінен быў надысці этап сінтэзу назапашанага матэрыялу. Гэты этап не мог не звярнуцца да папулярнай у наш час ідэі тлумачэння асаблівасцей лексікі праз аналіз прагматыкі моўных адзінак. Не менш падстаў ёсць для таго, каб звярнуцца да сігматычных асаблівасцей уласных імёнаў геаграфічных аб’ектаў.

Мэта нашай працы – абгрунтаваць магчымасць вывучэння ўласных імёнаў з пазіцый чацвёртага вымярэння знака – яго сігматыкі. *Дасягненне* пастаўленай мэты патрабуе рашэння наступных задач: 1) вызначэння індэксальных, іканічных і сімвалічных асаблівасцей тапонімаў, адбор і аналіз тых асаблівасцей, якія дазваляюць растлумачыць з функцыянальных пазіцый працу сістэмы гэтых імёнаў; 2) апісання гісторыі вывучэння семіятычных вымярэнняў тапонімаў – сінтактыкі, семантыкі, прагматыкі; 3) прапанавання скласці схему сігматыка-прагматычнага падыходу да тапонімаў.

Асноўная частка. Пільная ўвага, якая надаецца тапонімам і, увогуле, уласным імёнам не толькі лінгвістамі, але таксама логікамі, філосафамі, географамі, гісторыкамі, не магла не адбіцца на колькасці матэрыялу, уцягнутага ў абарот гэтага раздзела навукі пра мову. Тапаніміка не скардзіцца на адсутнасць матэрыялу і статыстычных падлікаў. У сучаснай навуцы аб уласных імёнах найбольшую складанасць уяўляе малая колькасць работ тэарэтычнага плана [5, с. 40], прычым працягваюцца пошук і апрацоўка без таго шырокага комплексу новых імёнаў. Неабходнасць філасофскага асэнсавання існуючых у анамастыцы фактычных даных адзначае Д. І. Рудэнка: «Неабходна не мадыфікаваць дэфініцыі, а ўдакладніць агульны падыход да ўласных імёнаў» [3, с. 58].

За сінтэзам назапашанага матэрыялу можа прыйсці ўсведамленне таго, што тапонімы – гэта таксама паўнавартасныя знакі мовы. Вось толькі якія? Нават заснавальнік семіётыкі Чарльз Сандэрс Пірс не здолеў прывесці прыклад чыстага індэкса [8, с. 96] і адзначаў, што ў ідэальных знаках «іканічная, індэксальная, сімвалічная прыметы змяшаныя па магчымасці ў роўных адносінах» [9, с. 106].

Разам з тым сам Пірс спасылаўся на традыцыйна індэксальную, прычынную прыроду ўласных імёнаў: «Іх, верагодна, варта разглядаць як Індэксы, паколькі толькі сапраўдная сувязь інстанцый адных і тых жа тыповых слоў з іх Аб'ектамі становіцца прычынай інтэрпрэтацыі гэтых тыповых слоў як тых, што дэнатуюць дадзеныя Аб'екты» [10, с. 243]. Сапраўды, па традыцыі імёны ўласныя лічацца знакамі намінатыўнымі, якія не характарызуюць, а толькі паказваюць на аб'ект, адсылаюць да яго [11, с. 62 і інш.]. Дадзенае разуменне сутнасці імёнаў ідзе ад Дж. С. Міля [12, с. 979]. Ва ўмовах міжасобаснага абмену знакамі, як правільна заўважыў Карл Бюлер, менавіта такая рэдукцыя кагнітыўнага зместу дазваляе людзям бесперашкодна скараціць ступень індывідуальнай свабоды і мець зносіны [13, с. 211–212].

Зрэшты, той жа К. Бюлер звярнуў увагу на тое, што падыход Э. Гусэрля, які разглядаў імёны ў інтэлектуальных актах, а не ва ўмовах міжасобасных зносін, не менш варты ўвагі, чым падыход Дж. С. Міля: «Гаворка ідзе пра дзве праграмы, рэалізаваныя з прываблівай паслядоўнасцю. Ці варта адразу ж што-небудзь адпрэчваць?» [13, с. 211–212]. Мяркуем, што не варта. Інтарэс лінгвістаў канца XX – пачатку XXI стагоддзя да кагнітыўных уласцівасцей мовы спарадзіў натуральную цікавасць да альтэрнатыўнага пункта гледжання.

Указанне на індэксальную прыроду ўласных імёнаў не вычэрпвае ні своеасаблівасці онімаў, ні спектра магчымых характарыстык гэтых знакаў. Большасць традыцыйных работ сведчыць аб тэндэнцыі да страты матываванасці, г.зн. «павышанай цязе да сімвалічнасці» [14, с. 108], што выяўляецца ў тапонімах. Так, паводле падлікаў В. А. Жучкевіча, сярод назваў рэк толькі 23% атрымалі больш-менш дакладную інтэрпрэтацыю, а азёры маюць празрыстыя сувязі з іншымі словамі ў 28% выпадкаў [15, с. 10]. Бясспрэчна, значная частка назваў самых буйных натуральных аб'ектаў (рэк, азёр) цяпер можа разглядацца як умоўныя знакі (сімвалы, паводле тэрміналогіі Ч. С. Пірса), але зводзіць «жывую» да гэтага часу працу тапасістэмы да «прыляплення ярлыкоў», як гэта рабіў Дж. С. Міль, мабыць, не варта. Тым больш, што Ч. С. Пірс у сваіх «Пралегоменах да апалогіі прагматызму» паспеў адзначыць адсутнасць экспланаторных патэнцый сімвалаў [10, с. 223]. Умоўны характар сувязі знакаў не дазваляе ім быць інтэрпрэтаванымі. Гэта пагадненне паміж камунікантамі, звычка, якую варта запомніць, а не зразумець.

Як адзначаў Ч. С. Пірс, «для развагі асабліва неабходныя іконы» [10, с. 224]. Невыпадкова ў ліку прынцыпаў кагнітыўнай лінгвістыкі, якая арыентуецца на інтэрпрэтацыйныя магчымасці моўных мадэляў, першым ідзе прынцып іканічнасці [16, с. 76]: «патрэбнасць ужыць іконы ўзнікае, галоўным чынам, тады, калі варта паказаць Формы сінтэзу элементаў думкі» [10, с. 243]. Паняцце іконы ў пірсаўскім разуменні рэанімавала магчымасць уключыць у план зместу знака і элемент прадстаўлення аб аб'екце, які не мог не адбіцца ў мове як самым дакладным сродку перадачы інфармацыі. Заклік да ўліку ролі вобразнага кампанента пры даследаванні намінацый быў зроблены ў савецкім мовазнаўстве арлоўскім анамасіёлагам С. Ф. Іларыёнавым: «Сустрэўшыся з яшчэ не названым прадметам або прадметам, які патрабуе новай назвы, чалавечая свядомасць у першую чаргу ўключае ўяўленне аб ім у сістэму вобразнай памяці і толькі на наступным этапе, аналізуючы гэты вобраз, супастаўляючы яго з іншымі, падобнымі да яго, выпрацоўвае паняцце, сінтаксічна аб'ектывуючы яго ў форме апісання» [17, с. 103].

У сучасным тапаніміконе метафарычныя адзінкі сустракаюцца ў найменнях геаграфічных аб'ектаў вельмі рэдка, спарадычна [18, с. 90]. Да таго ж нават у бясспрэчных, на першы погляд, метафарычных назвах матывацыі тапонімаў кшталту пожня *Каўрыга* «інфарманты даюць не як несумненныя, а як імаверныя» [14, с. 108]. Разам з тым чалавек не можа не выказваць свайго стаўлення да розных аб'ектаў свету і не заўважаць падабенства ў адных і тых жа аб'ектах. Вобразнасць асноўнай часткі сучасных найменняў непрыкметна толькі таму, што яны перастаюць быць моўнымі метафарамі, застаючыся метафарамі кагнітыўнымі. Падабенства перамяшчаецца з зоны непасрэднага адлюстравання аб'екта ў слове (назвы балот бел. *Жарнавок*, англ. *Little Hell*) у галіну схематызацый, фрэймаў і г. д. Рознае стаўленне да рэалій свету ў чалавека непрыкметна ў адзінкавых прыкладах, але пры масавым супастаўленні імёнаў становіцца відавочным. Сучасныя іканічныя знакі ў тапаніміі – гэта іконы-дыяграмы, а не іконы-вобразы.

Іканічнасць у тапонімах лёгка выявіць. У працах тапанімістаў-структуралістаў не аднойчы адзначалася, што імя ўласнае імкнецца адарвацца ад апелятыва, які яго матываваў. Звычайна ў гэтым выпадку дадаецца тапафармант, прычым ён можа быць не толькі словаўтваральнай марфемай, але таксама складанай часткай слова, якая ў агульных імёнах адносіцца да ліку словазмяняльных. Род тапоніма не абавязкова суадносіцца з родам наменклатурнага тэрміна (балота *Бярозавік*, рака *Неман* і інш.), а форма множнага ліку звычайна не сведчыць аб рэальнай множнасці аб'ектаў (населеныя пункты *Калінкавічы, Хойнікі* і інш.). Часта марфалагічныя паказчыкі з'яўляюцца толькі дэрывацыйнымі марфемамі [19, с. 76 і інш.]. Пра гэта сведчыць і такі папулярны ў беларускіх назвах спосаб онімаўтварэння, як плюралізацыя: мост > балота *Масты*, і флектывізацыя, якая адзначаецца ў некаторых імёнах: р. *Волга* > воз. *Волг**о***. Такім чынам, граматычнае структураванне ў тапонімах ажыццяўляюць, па сутнасці, толькі марфемы-дэрыватары, а само з'яўленне словаўтваральнага сродку (у тым ліку флексіі ва ўласных імёнах) сведчыць пра асаблівую ўвагу да дадзенага аб'екта, пра жаданне адмежаваць яго ад зыходнага наймення, пры дапамозе матэрыяльных сродкаў пазбавіцца ад «тапанімнай аманіміі».

Красамоўным сведчаннем іканічнасці тапаніміі з'яўляюцца таксама выпадкі, калі ўласныя імёны ўтвараюцца ад іншых уласных імёнаў пры дапамозе матэрыяльных пашыральнікаў асновы – марфем і слоў: вёска *Талынава* > балота *Талынаўскі Мох* і інш. У вытворных словах ва ўсіх падобных выпадках будзе мінімум на адну марфему больш, чым у тых, ад якіх словы ўтварыліся. Такім чынам, у пэўным сэнсе такая суаднесенасць будзе паўтараць адносіны паміж аб'ектамі, тыя адносіны, якія ўяўляюцца суб'екту пазнання актуальнымі ў дадзены момант. Як правіла, элемент макраўзроўню (моцны разрад) дубліруецца на мікраўзроўні (слабы разрад) [5, с. 44; 20, с. 59], г. зн. мінімум на адну словаўтваральную марфему будзе больш у назвах мікрааб'ектаў.

Да ліку вытворных тапанімных адзінак належаць і семантычныя дэрываты, у якіх не адбываецца дабаўленне матэрыяльна выражанага фарманта. Аднак калі звярнуць увагу на ўзаемадзеянне такіх адзінак у межах цэласнай сістэмы імёнаў пэўнай мясцовасці, то можна заўважыць, што менш буйныя і менш устойлівыя аб'екты надзяляюцца такімі імёнамі значна часцей, чым аб'екты буйныя і ўстойлівыя. Мікрааб'екты з'яўляюцца і знікаюць (зарастаюць, высыхаюць ці, наадварот, запаўняюцца вадой, калі казаць аб водных аб'ектах), за імі чалавечаму воку ўсачыць больш складана, чым за макрааб'ектамі. Ландшафт, змяняючыся, не заўсёды аказваецца дакладна адлюстраваным у моўных знаках з прычыны высокай дынамікі змяненняў у навакольнай рэчаіснасці (варыянт: чалавек не хоча змяняць звычак і называе ранейшым імем нават тыя аб'екты, якія перарадзіліся) альбо мікрааб'ект уяўляецца чалавеку менш прыкметным, а таму і менш значным арыенцірам. У апошнім выпадку ў імені адлюстроўваецца не сам аб'ект, а яго акружэнне: *Каменны Лог* як назва балота.

З чатырох аспектаў вывучэння знакаў – сінтактыка, семантыка, прагматыка, сігматыка – у тапанімных даследаваннях да нядаўняга часу выкарыстоўваўся, па вялікім рахунку, толькі першы. Гэта лёгка растлумачыць: «Развіваць сінтактыку прасцей ... чым апісваць аб'ектыўна існуючыя сітуацыі, у якіх ужываюцца тыя ці іншыя знакі, або апісваць тое, што адбываецца ў інтэрпрэтатары, калі функцыянуе знак» [21, с. 50].

З першых крокаў тапаніміка разглядалася як галіна мовазнаўства, для якой важна аддзяліць тапафармант ад тапаасновы. Увага даследчыкаў да фармальнага боку тапазнака на пачатковым этапе развіцця навукі аб геаграфічных імёнах цалкам абгрунтавана: «Перш чым прыступіць да сістэматызацыі змястоўных структур мовы, неабходна валодаць сістэматычнымі апісаннямі яго фармальных структур» [22, с. 113]. Аднак у тапаніміцы, ды і ў анамастыцы ў цэлым, перыяд толькі фармальных пошукаў быў залішне зацяжным. Да таго ж лінгвістычныя вынікі тапанімічных даследаванняў часта выкарыстоўваліся толькі як дапаможныя. Знаходзячыся пад уплывам ідэі аб трыадзінстве тапанімікі [23, с. 6 і інш.], анамасты абвясцілі суфікс «пазначаным атамам» [24, с. 83], здольным тлумачыць гістарычныя перамяшчэнні народаў. Роля асновы, на іх думку, заключаецца ў адрозненні онімаў у межах шэрага імёнаў (гэта і ёсць функцыя тапоніма!), але з прычыны частай дээтымалагізацыі асновы – асабліва ў субстратных імёнах – яе назвалі менш значнай для навукі. В. А. Жучкевіч адзначае: «Корань, суфікс, прыстаўка, канчатак у шэрагу тапонімаў незразумелага сэнсавага значэння цяжка вылучыць і вызначыць. У гэтых выпадках даводзіцца абмяжоўвацца размеркаваннем тапонімаў па фармантах, разумеючы пад апошнімі тыповыя словы, якія паўтараюцца ад назвы да назвы, падобныя

па форме і гучанню, дзе фармант можа апынуцца або іншамоўным тэрмінам, або спалучэннем каранёвай часткі і рускага канчатка, або, нарэшце, іншамоўным суфіксам» [25, с. 94]. Знакавасць такой адзінкі, як тапонім пры падобным разуменні адыходзіць на задні план, а то і папросту здымаецца (галоўнае не тапазнак, а лакалізацыя тапафарманта). Акрамя таго, пры беззмястоўным вывучэнні тапаніміі выявіўся яшчэ адзін заган – перагружанасць тапанімічных работ лічбамі і працэнтамі [26, с. 4]. А. К. Матвееў падвёў несуцяшальны вынік: «Развіваючыся па такім шляху, тапанамастыка хутка вычарпае свае магчымасці з прычыны абмежаванасці праблематыкі» [26, с. 4].

Сінтактыка – самая распрацаваная частка тапанімных даследаванняў. Па словах Ч. Морыса, «паспяховае развіццё семантыкі прадугледжвае адносна высока развітую сінтактыку» [21, с. 55]. Аднак у дачыненні да онімаў, як мы ўжо адзначалі, нельга казаць аб іх семантычнай напоўненасці ў літаральным сэнсе слова. Пераважная цікавасць тапанімістаў да сінтактыкі абумоўлена, у першую чаргу, тым відавочным фактам, што ўласныя імёны значна часцей, чым агульныя імёны, страчваюць унутраную форму. Таксама відавочна тое, што абавязковы кампанент адзінкавасці і ўнікальнасці, які прысутнічае ў кожным уласным імені, не дазваляе яму «абзавесціся» паняційным, узуальным значэннем. Таму звычайна лінгвісты кажуць не аб семантыцы ўласных імёнаў, а аб семантыцы іх асноў. Апошняя даволі часта аказваецца непразрыстай, асабліва ў імёнах буйных і найбольш старажытных аб'ектаў.

Зараз прагматыка – галіна семіётыкі, якая даследуе стаўленне суб'екта (чалавека) да знака – гэта зона актыўнага выкарыстання лінгвістамі-тапанімістамі, аднак многія пытанні патрабуюць удакладнення.

Першымі даследчыкамі найменняў адзінкавых аб'ектаў з пункта гледжання значнасці для чалавека пэўнай культуры – А. Л. Беразовіч, М. Э. Рут (а следам за імі і іншымі рускімі даследчыкамі) – было прапанавана разуменне імёнаў як рэпрэзентантаў канкрэтна-пачуццёвых уяўленняў пэўнага этнасу аб рэчаіснасці: «Закладзеная ў назве прымета прадмета адлюстроўвае найбольш устойлівае ў свядомасці носьбіта мовы ўяўленне аб аб'екце, прычым не толькі якое склалася да назвы, але і зацверджанае ў свядомасці самім фактам існавання матываванага слова» [27, с. 34]. Гаворка тут ідзе пра канцэптуальнасць уласнага імені, энцыклапедычнасць яго значэння. Пры падобным падыходзе захоўваецца цікавасць да матывацыі імені, спроб яе растлумачыць уяўленнямі аб свеце, культурай пэўнага народа. Аднак узнікае ўражанне дэжавю. Па сутнасці, такая трактоўка нагадвае ланцужок намінатыўнага працэсу, які даваўся ў артыкуле Н. В. Аўчар [28, с. 61]: аб'ект у сукупнасці ўласцівасцей і якасцей > уяўленне чалавека аб прымеце/прыметах аб'екта > матэрыялізацыя ўяўленняў у мове.

А. Л. Беразовіч разглядае вынікі дзейнасці аналізатараў чалавека, яго адчуванне аб'екта і самога сябе адносна гэтых аб'ектаў. Як вынік, мы бачым цэлую серыю параметраў, якія ўлічваюць (і вельмі дэталёва) экстралінгвістычнае акружэнне тапоніма: па праяўленасці/імплікаванасці суб'екта назірання, па накіраванасці арыентацыі, па каардынуючым механізме, па аб'ёме ахопу тэрыторыі, па характары счаплення элементаў прасторавай карціны свету, па задзейнічанні прасторавай гарызанталі/вертыкалі і г. д. [29, с. 16–18]. Усе тапонімы вывучаюцца як такія, што належаць да аднаго класа. Незразумела, за кошт чаго сістэме атрымоўваецца функцыянаваць, не распадаючыся на асобныя складаныя часткі. Не ў кожным тапанімным знаку можна сустрэць, скажам, такі параметр, як дробнасць успрымання прасторы. Незразумела, якім чынам тое, што было адзначана ў асобных знаках, звязана з астатнімі знакамі, складнікамі сістэмы або падсістэмы. Характарызуецца хутчэй чалавек пэўнай культуры і параметры яго статычнага ўспрымання прасторы наогул, чым сувязь чалавека, тапааб'ектаў розных відаў і мовы ў працэсе пазнання.

Прывядзем яшчэ адну цытату, якая дэманструе пазіцыю тапанімістаў гэтага напрамку: «Малюючы, мастак прадумвае сюжэт, выбудоўвае кампазіцыю, змешвае фарбы, падкрэслівае тыя ці іншыя дэталі, дамагаецца эфекту рознай асветленасці, каб выказаць сваё стаўленне да прадмета, які адлюстроўваецца. Менавіта такім "мастаком" з'яўляецца носьбіт мовы, адначасова адлюстроўваючы ў намінатыўных адзінках сваё стаўленне і да з'явы, якая называецца, і да з'явы, якая пазначаецца яго матывавальным... На змену фіксацыі тых ці іншых рыс аб'екта прыходзіць інтэрпрэтацыя. Носьбіт мовы з рэаліста ператвараецца ў імпрэсіяніста, адлюстроўваючы сваё ўражанне ад рэаліі» [27, с. 35].

На наш погляд, такі пункт гледжання не суадносіцца з традыцыйным пазнавальным ланцужком: ад жывога сузірання да абстрактнага мыслення і ад яго да практыкі. Калі чалавек спачатку прадумвае сюжэт, а толькі потым пачынае да яго неяк ставіцца, то атрымліваецца, што пачуцці з'яўляюцца ў яго пазней розуму. На нашу думку, пры стварэнні назвы чалавек пачынае, хутчэй, як імпрэсіяніст і толькі затым – паступова – рухаецца да рэальнай абмалёўкі кожнай канкрэтнай дэталі сустрэтага аб'екта або з'явы. Што тычыцца асобных дэталяў, якія заўважаюцца чалавекам і кладуцца ў аснову тапонімаў, то варта звярнуць увагу на першапачатковую сузіральнасць чалавека: ён спачатку звяртае ўвагу на рэчы, якія аказваюцца ў большай ступені патрэбнымі яму, а разуменне важнасці аб'екта прыходзіць як вынік частых сустрэч з ім. Дэталі тут, як нам уяўляецца, менш важныя, чым агульны погляд.

На нашу думку, культурацэнтрычны (а таму, несумненна, звязаны з прагматыкай) падыход можа разглядацца толькі як адзін з двух асноўных шляхоў вывучэння чалавечага ўспрымання аб'ектаў: 1) вывучэнне характарыстык вобраза; 2) вывучэнне самога механізма ўспрымання [30]. Па словах французскага псіхолага Жана Піяжэ, «веданне – гэта не вынік чыстага ўспрымання, паколькі ўспрыманне заўсёды накіроўваецца і абмяжоўваецца схемамі дзеяння. Пазнанне пачынаецца з дзеяння, а ўсякае дзеянне паўтараецца або абагульняецца (генералізуецца)» [31, с. 61]. Такім чынам, іншым кірункам вывучэння сэнсавага патэнцыялу тапонімаў павінен стаць пошук механізма ўспрымання тапааб'ектаў розных класаў, выяўленне генералізуючых схем, па якіх ажыццяўляецца надзяленне адзінкавага аб'екта імем.

Калі заставацца на ўзроўні пошуку асобных прымет аб'ектаў і ўяўленняў народа аб іх, то можна сабраць сукупнасць усіх уласцівасцей аб'ектаў, але не атрымаць цэласных вобразаў кожнага з відаў аб'ектаў. Наўрад ці чалавек ставіцца аднолькава да рэк, азёр ці балот, да лясоў ці раўнін. Па словах Ч. С. Пірса, «кропкай, ад якой бярэ пачатак усякае лагічнае разважанне, з'яўляюцца не пачуццёвыя ўражанні, але аб'екты ўспрымання» [10, с. 298].

Мы таксама мяркуем, што чалавек аналізуе перш за ўсё не прыметы, а аб'екты/з'явы. Падыход ад аб'екта дазваляе задзейнічаць у тапанімным даследаванні апошні з чатырох аспектаў плана зместу знака – сігматычны, або дэнататыўны. Разам з тым не падлягае сумненню, што выбар аб'екта намінацыі і надзяленне яго імем залежыць ад значнасці аб'екта для суб'екта. У тапаніміцы важнасць аб'екта ўспрымання (а не прыметы) даказваецца тым, што ў большасці выпадкаў уласныя імёны з'яўляюцца субстантывамі. У славянскай «сінтэтычнай» тапаніміі гэта заўважаецца асабліва добра, бо субстантыватар там звычайна згортваецца ў афіксальны фармант: азёры *Глыбач**ка**, Чамар**ыца**, Бярн**ова**, Уклей**на**, Езар**ышча**, Янк**ішкі***, балоты *Палон**ка**, Журб**іца**, Амел**іна**, Брус**ова**, Бродна, Лядз**ішча**, Сол**ішкі*** і інш. Вельмі невялікая колькасць адзінак прадстаўлена ў форме прыметніка, ды і тыя, па вялікім рахунку, часцей фіксуюцца побач з неэліпсаванымі тапанімнымі спалучэннямі, г.зн. геаграфічны апелятыў звычайна маецца на ўвазе: *Сарочынскае, Кузьмінскае, Буслаў Барок, Дзегцеў Луг* і г. д. Тапанімісты і анамасіёлагі таксама заўважаюць: шлях намінацыі ляжыць ад апісальных канструкцый да аднаслоўных адзінак [32, с. 94]. Наўрад ці намінацыя аб'екта спалучэннем слоў магла пачынацца з больш абстрактнай, чым прадмет, прыметы; тым больш, што гэта была прымета канкрэтнага аб'екта.

Таму, верагодна, у схему намінатыўнай дзейнасці суб'екта варта ўключыць уяўленне аб аб'екце ў цэлым (гл. схему Н. Аўчар [28, с. 61]). Акрамя таго, увядзенне ў мадэль новага кампанента выклікае пытанне аб узаемадзеянні традыцыйнага для тапанімікі ўяўлення аб прымеце і прапанаванага намі ўяўлення аб аб'екце, г. зн. аб катэгарыйным узаемадзеянні двух кампанентаў.

Такім чынам, неабходна пераўтварыць саму схему аналізу намінатыўнага працэсу ў тапаніміі: аб'ект у сукупнасці ўласцівасцей і якасцей > уяўленне аб аб'екце ў цэлым > уяўленне аб прымеце/прыметах аб'екта > катэгарыяльнае ўяўленне аб аб'екце і яго прыметах > матэрыялізацыя ўяўленняў у мове.

На нашу думку, тапаніміка з пазіцый сігматыкі – гэта паказ таго, якім чынам прырода і значнасць аб'екта для чалавека прымушае выпрацаваць звычкі разглядаць пэўны род аб'ектаў пад тым ці іншым пунктам гледжання (ментальныя рэпрэзентацыі) і абазначыць аб'екты розных падсістэм рознымі семіятычнымі структурамі: «два суб'екты могуць толькі разглядацца як падобныя – калі ў розуме яны параўноўваюцца і зводзяцца разам» [10, с. 28].

Калі ўзяць на ўзбраенне анамасіялагічную ідэю, г. зн. пайсці ад прадметаў да іх матэрыяльнага адлюстравання ў мове, то замест адзінай тапанімнай сеткі мы атрымаем цэлы шэраг узаемазвязаных і перасякальных сетак, якія накладваюцца адна на адну – звышскладаную сістэму, у падсістэмах якой можна выявіць і падобныя працэсы, і розную колькасную прадстаўленасць гэтых працэсаў. Суаднясенне заканамернасцей каварыяцыі назіраемых моўных з'яў і прадметнага рада, адлюстраванага ў свядомасці суб'екта, можа саслужыць добрую службу як семіётыцы, так і тэорыі намінацыі.

Веданне словаўтваральнай матывацыі – гэта толькі веданне знешняе, даступнае пры прамым назіранні ў кожным канкрэтным імені паасобку. Гэта веданне аб нашым успрыманні асобных элементаў, але не веданне аб тым, як яно ўпарадкоўваецца і дзякуючы чаму сістэма паспяхова функцыянуе. Назіранне за дзейнасцю чалавека дэманструе пакрокавую і павольную выпрацоўку асноўных шаблонаў для стварэння гатовых новых формаў імёнаў. Пры гэтым усе ўяўленні аб канкрэтным аб'екце непазбежна спрашчаюцца. Таму, як мы лічым, можна казаць аб двух відах канцэптаў: 1) кантэкстуальным/пачуццёвым-канкрэтным, дзе важнай будзе любая канкрэтная дэталь для стварэння адзінага вобраза; 2) праксічным, дзе прагматычныя фактары шукаюцца толькі ў межах знака і суадносяцца з функцыяй, якую знак адыгрывае ў грамадстве, і стаўленнем чалавека да імёнаў як больш ці менш значных арыенціраў. Калі першы з канцэптаў можна разглядаць як неўпарадкаваную сукупнасць пачуццёвых звестак аб аб'екце свету, то другі варта разумець як вопыт чалавека, здольнага ўжываць гатовыя і з улікам умоў акружэння аб'екта ствараць новыя катэгарызацыйныя шаблоны для класіфікацыі і намінацыі асобных з'яў рэальнасці.

Ступені ўспрымання аб'ектаў як арыенціраў у прасторы, калі ўзяць пад увагу прагматыку імёнаў у звязку з іх сігматычнымі асаблівасцямі, будуць адлюстраваны ў чатырох наступных катэгарызацыйных шаблонах.

1. **Трансляцыя акружэння** як паказчык «тапанімічнай слепаты» да аб'екта ці да змен, якія з ім адбыліся: *Свая Пушча* (балота), *Белае балота* (лес), *Сямчонкаў хутар* (поле), *Чэрнікаў лес* (сенажаць).

2. **Канстатацыя прысутнасці**. Геаграфічны тэрмін як амонім тапоніма: бел. *Возера* (возера), *Горы* (горы), *Балота (балота), Рака* (рака).

3. **Усведамленне адрозненняў**. Першыя прыметы цікавасці да адзінкавага аб'екта: ***Бярозавае** балота, **Мядзведня**, **Чысц**ік*.

4. **Размежаванне падабенства**. Пазбаўленне ад тоесных назваў сумежных аб'ектаў: *Брускае > Брускае **2**, Малое > Малое **Ніжняе***.

Вопыт працы з імёнамі сведчыць пра тое, што мікратапонімы часцей ужываюць шаблоны 1 і 2, а ўласна тапонімы аддаюць перавагу шаблону 3. Апошняя з альтэрнатыў назіраецца ў назвах аб'ектаў, якія складалі некалі частку цэлага (назвы балот: *Каменка > Гарэлая Каменка* і інш.), да гэтай пары знаходзяцца побач (назвы населеных пунктаў: *Вялікае Зарэчча – Малое Зарэчча* і інш.) ці застаюцца часткай аб'екта (рэкі ці прытокі рэк: *Левая Лясная – Правая Лясная* і інш.).

Тапанімныя класы варта разглядаць не толькі і не столькі паасобку (выяўляючы ўсе іх субстанцыяльныя ўласцівасці), колькі на фоне адзін аднаго (разглядаючы колькасныя перавагі кожнай з падсістэм). Такі погляд дазволіць разглядаць натуральныя катэгорыі намінатыўных адзінак, бо, верагодна, сам механізм надзялення адзінкавых аб'ектаў уласнымі імёнамі павінен быць падобным у кожнай з падсістэм тапаніміі: кожнае з адзінкавых імёнаў інтэнцыяльна накіравана на пошук адметнай, дыферэнцыруючай прыметы.

Высновы. Такім чынам, тапонім, як і іншыя паўнавартасныя моўныя знакі, нельга звесці да адназначна зададзенага месца ў семіятычнай класіфікацыі. Найбольшую тлумачальную сілу даследаванню здольна надаць спалучэнне прагматычнага аспекта з сігматычнымі заканамернасцямі, што дазваляе суаднесці знакі адзін з адным, са знешнім светам і стаўленнем чалавека да розных відаў аб'ектаў свету. Пры гэтым элементы разглядаюцца як узаемазвязаныя часткі адзінай сістэмы, а дзейнасць інтэрпрэтатара сістэмы не выходзіць за межы знакаў. У аснове падобнага супастаўлення ляжыць прынцып іканічнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Лотман, Ю. М. Миф – имя – культура / Ю. С. Лотман // Избранные статьи: в 3 т. – Таллин, 1992. – Т. 1. – С. 58–75.

2. Руднев, В. П. Словарь культуры XX века / В. П. Руднев. – М.: Аграф, 1997.

3. Руденко, Д. И. Собственные имена в контексте современных теорий референции / Д. И. Руденко // Вопр. языкознания. – 1988. – № 3. – С. 55–68.

4. Матвеев, А. К. Образное народное видение проблемы ономасиологической и этимологической интерпретации топонимов / А. К. Матвеев // Вопр. ономастики. – Вып. 12: Русская топонимия и географическая терминология. – Свердловск, 1977. – С. 5–20.

5. Березович, Е. Л. Русская ономастика на современном этапе: критические заметки / Е. Л. Березович // Изв. РАН. Сер. лит. и яз. – 2001. – Т. 60, № 6. – С. 34–46.

6. Уфимцева, А. А. Лексическая номинация (первичная, нейтральная) / А. А. Уфимцева // Языковая номинация: (Виды наименований) / А. А.Уфимцева, Э. С. Азнаурова, В. Н. Телия [и др.]; отв. ред. А. Н. Серебренников. – М.: Наука, 1977. – С. 5–85.

7. Агеева, Р. А. Гидронимия Русского Северо-Запада как источник культурно-исторической информации / Р. А. Агеева. – М.: Наука, 1989. – 252 с.

8. Пирс, Ч. С. Логические основания Теории знаков / Ч. С. Пирс. – СПб., 2000.

9. Якобсон, Р. О. В поисках сущности языка / Р. О. Якобсон // Семиотика ; сост., вступ. ст. и общ. ред. Ю. С. Степанова.– М.: Радуга, 1983. – С. 102–117.

10. Пирс, Ч. С. Начала прагматизма / Ч. С. Пирс. – СПб., 2000.

11. Руденко, Д. И. Философия имени: в поисках новых пространств / Д. И. Руденко, Ю. И. Сватко. – Харьков: ОКО, 1993. – 104 с.

12. Mill, J. S. The Collected Works of John Stuart Mill, Vol. VIII / J. S. Mill // A System of Logic Ratiocinative and Inductive Part II, 1843.

13. Бюлер, К. Теория языка. Репрезентативная функции яязыка/ К. Бюлер. – М.: Прогресс, Универс, 1993. – 528 с.

14. Рут, М. Э. Образная номинация в русском языке / М. Э. Рут. – Екатеринбург: Изд-во Урал. ун-та, 1992. – 148 с.

15. Жучкевич, В. А. Происхождение географических названий (топонимика) Белоруссии / В. А. Жучкевич.– Минск: Изд-во Белгосуниверситета им. В. И. Ленина, 1961. – 79 с.

16. Кубрякова, Е. С. Краткий словарь когнитивных терминов/ Е. С. Кубрякова [и др.]; под ред. Е. С. Кубряковой. – М., 1996. – 248 с.

17. Илларионов, С. Ф. Об образном компоненте в семантике слова и о его роли в выборе производящего / С. Ф. Илларионов // Проблемы ономасиологии: науч. тр. ; под ред. И. С. Торопцева.– Курск, 1976. – Т. 62 (155), вып. 3. – С. 103–109.

18. Нечай, М. Н. Семантика географического термина и его употребительность в топонимии / М. Н. Нечай // Номинация в ономастике: сб. ст. ; под ред. М. Э.Рут. – Свердловск: Изд-во Урал. ун-та, 1991. – С. 90–94.

19. Воробьёва, И. А. Ономастика в школе / И. А. Воробьёва. – Барнаул, 1987. – 109 с.

20. Супрун, В. И. Ономастическое поле русского языка и его художественно-эстетический потенциал / В. И. Супрун. – Волгоград: Перемена, 2000. – 172 с.

21. Моррис, Ч. У. Основания теории знаков / Ч. У. Моррис // Семиотика; сост., вступ. ст. и общ. ред. Ю. С. Степанова.– М.: Радуга, 1983. – С. 37–89.

22. Даниленко, В. П. Ономасиологическое направление в истории грамматики / В. П. Даниленко // Вопр. языкознания. – 1988. – № 3. – С. 108–131.

23. Мурзаев, Э. М. Очерки топонимики / Э. М. Мурзаев. – М.: Мысль, 1974.

24. Никонов, В. А. Введение в топонимику / В. А. Никонов. – М.: Наука, 1965.

25. Жучкевич, В. А. Общая топонимика / В. А. Жучкевич. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйш. шк., 1968. – 432 с.

26. Матвеев, А. К. Топономастика и современность / А. К. Матвеев // Вопр. ономастики. – Свердловск, 1974. – Вып. 8–9. – С. 4–14.

27. Березович, Е. Л. Ономасиологический портрет реалии как жанр лингвокультурологического описания / Е. Л. Березович, М. Э. Рут // Изв. Урал. гос. ун-та. – 2000. – № 17. – С. 33–38.

28. Овчар, Н. В. Опыт идеографического описания озерных гидронимов русского Севера / Н. В. Овчар // Номинация в ономастике: сб. ст. ; под ред. М. Э. Рут. – Свердловск: Изд-во Урал. ун-та, 1991. – С. 60–74.

29. Березович, Е. Л. Русская топонимия в этнолингвистическом аспекте: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01 / Урал. гос. ун-т им. А. М.Горького / Е. Л. Березович. – Екатеринбург, 1999.

30. Черниговская, Т. В. Восприятие / Т. В. Черниговская // Курс дистанционного обучения психолингвистике [Электронный ресурс]. – Режим доступа : www.csa.ru/DistanceLearning/course2.index.html. – Дата доступа : 10.12.2003.

31. Пиаже, Ж. Психогенез знаний и его эпистемологическое значение / Ж. Пиаже // Семиотика ; сост., вступ. ст. и общ. ред. Ю. С. Степанова.– М.: Радуга, 1983. – С. 90–101.

32. Голев, Н. Д. Естественная номинация объектов природы собственными и нарицательными именами / Н. Д. Голев // Вопр. ономастики. – 1974. – № 8–9. – С. 88–97.

References

1. Lotman Yu.M., "Myth – Name – Culture", Izbrannye stat'i [Selected articles], 1992, vol. 1, pp. 58–75.

2. Rudnev V. P., Slovar' kul'tury XX veka [Dictionary of the Twentieth Century Culture], Agraf, Moscow, RU, 1997.

3. Rudenko D. I., "Proper Names in the Context of Modern Referential Theories", Voprosy iazykoznaniia [Problems of Linguistics], 1988, no. 3, pp. 55–68.

4. Matveev A. K., "Figurative Folk Vision of the Problem of Onomasiological and Etymological Interpretation of Place Names", Voprosy onomastiki [Problems of Onomastics], 1977, no. 12, pp. 5–20.

5. Berezovich E. L., "Russian Onomastics at the Present Stage: Critical Notes", Izvestiia RAN. Seriia literatury i iazyka [Proceedings of the Russian Academy of Sciences. Series of literature and language], 2001, vol.60, no. 6, pp. 34–46.

6. Ufimtseva A. A., "Lexical Nomination (Primary, Neutral)", in Ufimtseva A.A., Aznaurova E.S., Teliia V.N., Kubriakova E.S., Arutiunova N.D., Iazykovaia nominatsiia: (Vidy naimenovanii) [Linguistic Nomination (Types of Names)], in Serebrennikov B.A., Ufimtseva A.A. (ed.), Nauka, Moscow, RU, 1977, pp. 5–85.

7. Ageeva R. A., Gidronimiia Russkogo Severo-Zapada kak istochnik kul'turno-istoricheskoi informatsii [Russian North-West Hydronyms as a Source of Cultural and Historical Information], Nauka, Moscow, RU, 1989.

8. Pirs Ch. S., Logicheskie osnovaniia Teorii znakov [Logical Foundations of the Theory of Signs], Aleteija, SPb, RU, 2000.

9. Iakobson R. O., "Searching for the Essence of Language", in Stepanov Iu. S. (ed.), Semiotika [Semiotocs], Raduga, Moscow, RU, 1983, pp. 102–117.

10. Pirs Ch. S., Nachala pragmatizma [Issues of Pragmatism], Aleteiia, SPb, RU, 2000.

11. Rudenko D. I., Svatko Iu. I., Filosofiia imeni: v poiskakh novykh prostranstv [Philosophy of Name: Searching for New Spaces], OKO, Kharkov, UA, 1993.

12. Mill J. S., A System of Logic Ratiocinative and Inductive, Part II, the University of Toronto Press, Toronto, CA, 2006 [1843].

13. Byuler K., Teoriia iazyka. Reprezentativnaia funktsiia iazyka [Theory of Language: The Representative Function of Language], Progress, Univers, Moscow, RU, 1993.

14. Rut M. E., Obraznaia nominatsiia v russkom iazyke [Figurative Nomination in the Russian Language], Izdatel'stvo Ural'skogo universiteta, Ekaterinburg, RU, 1992.

15. Zhuchkevich V.A., Proiskhozhdenie geograficheskikh nazvanii (toponimika) Belorussii [The Origin of Place Names (Toponymy) in Byelorussia], Izdatel'stvo Belgosuniversuteta im. V. I. Lenina, Minsk, BY, 1961.

16. Kubriakova E. S., Demiankov V.Z., Luzina L.G., Pankrats Yu.G., Kratkii slovar' kognitivnykh terminov [A Short Dictionary of Cognitive Terms], in Kubriakova E. S. (ed.), Moscow, RU, 1996.

17. Illarionov S.F., "On the Figurative Component in the Semantics of the Word and Its Role in the Choice of the Underlying Word", Problemy onomasiologii [Problems of onomasiology], in Toroptsev I. S. (ed.), Kursk, RU, 1976, vol. 62 (155), no. 3, pp. 103–109.

18. Nechai M. N., "Semantics of the Geographical Term and Its Usage in Toponymy", Nominatsiia v onomastike [Naming in onomastics], in Rut M. E. (ed.), Izdatel'stvo Ural'skogo universiteta, Sverdlovsk, RU, 1991, pp. 90–94.

19. Vorob'eva I. A., Onomastika v shkole [Onomastics at School], Barnaul, RU, 1987.

20. Suprun V. I., Onomasticheskoe pole russkogo iazyka i ego khudozhestvenno-esteticheskii potentsial [Onomastic Field of the Russian Language and Its Artistic and Aesthetic Potential], Peremena, Volgograd, RU, 2000.

21. Morris Ch. W., "Foundations of the Theory of Signs", in Stepanov Iu. S. (ed.), Semiotika [Semiotics], Raduga, Moscow, RU, 1983, pp. 37–89.

22. Danilenko V.P., "Onomasiological Trend in the History of Grammar", Voprosy iazykoznaniia [Problems of Linguistics], 1988, no. 3, pp. 108–131.

23. Murzaev E.M., Ocherki toponimiki [An Outline of Place Name Studies], Mysl', Moscow, RU, 1974.

24. Nikonov V. A., Vvedenie v toponimiku [Introduction into Toponymy], Nauka, Moscow, RU, 1965.

25. Zhuchkevich V.A., Obshchaia toponimika [General Toponymy], 2nd ed., Vysheishaia shkola, Minsk, BY, 1968.

26. Matveev A. K., "Toponomastics and Modernity", Voprosy onomastiki [Problems of Onomastics], 1974, no. 8–9, pp. 4–14.

27. Berezovich E. L., Rut M. E., "Onomasiological Portrait of a Reality as a Genre of Linguocultural Description", Izvestiia Ural'skogo gosudarstvennogo universiteta [Proceedings of the Ural State University], 2000, no. 17, pp. 33–38.

28. Ovchar N. V., "Experience of Ideographic Description of Lake Names of the Russian North", in Rut M. E. (ed.), Nominatsiia v onomastike [Naming in onomastics], Izdatel'stvo Ural'skogo universiteta, Sverdlovsk, RU, 1991, pp. 60–74.

29. Berezovich E. L., "Russian Place Names in Terms of Ethnolinguistic Aspect", Abstract of D. Sc. Dissertation, Russian language, Ural State University named after AM Gorky, Yekaterinburg, RU, 1999.

30. Chernigovskaia T. V., "Perception: A Distance Learning Course in Psycholinguistics", Available at: www.csa.ru/DistanceLearning/course2.index.html, (accessed 10 December 2003).

31. Piazhe Zh., "Psychogenesis of Knowledge and Its Epistemological Value", Semiotika [Semiotics], Raduga, Moscow, RU, 1983, pp. 90–101.

32. Golev N. D., "Natural Nomination of Natural Objects by Proper and Common Names", Voprosy onomastiki [Problems of Onomastics], 1974, no. 8–9, pp. 88–97.

Информация об авторе

Копач Олег Игоревич – канд. филол. наук, доцент. Белорусский государственный университет (ул. Курчатова, 5, 220045, Минск, Республика Беларусь). E-mail : aleh@bk.ru.

Для цитирования

Копач, А. І. Семіятычныя асаблівасці тапонімаў : сігматыка-прагматычны погляд / А. І. Копач // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 66–75.

Information about the author

Kopach Oleg Igorevich, Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Belarusian State University (5 Kurchatov Str., Minsk 220045, Belarus). E-mail: aleh@bk.ru.

For citation

Kopach A. I. Semiotic Peculiarities of Place Names: A Sigmatic and Pragmatic View. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 2, pp. 66–75.

ISSN 0321-1649 (print)

МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР

ART HISTORY, ETHNOGRAPHY, FOLKLORE

УДК 793.3

Паступіў у рэдакцыю 21.06.2016
Received 21.06.2016

Д. С. Скачкоў

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

ТАНЕЦ БУТА: АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ І ІХ АСЭНСАВАННЕ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ПЛАСТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

Танец Буто – авангардный стиль танца, который возник в Японии в начале 1960-х гг. в творчестве Т. Хиджиката и К. Оно. Танец Буто предложил радикально новые принципы организации хореографического материала и взаимоотношения исполнителя с его собственным телом, новаторские приемы работы с образом и сценическим пространством. Среди основных принципов танца Буто можно выделить акцентуацию на движение тела, а не на точную хореографию, принципы «пустого тела» и телесной археологии, пребывание актера и его тела в пограничном физическом и психическом состоянии, радикальную субъективность исполнителя, обращение к творческим силам подсознания, отказ от традиционных представлений о гармонии и красоте. В Беларуси танец Буто начинает осваиваться в начале 2000-х гг. и органично входит в сценическую практику отечественных хореографических коллективов и пластических театров, в том числе пластического театра «ИнЖест» В. Иноземцева и независимого хореографа И. Ануфриевой. Среди основных аспектов танца Буто, которые выделяют отечественные режиссеры и танцоры, можно назвать осмысленность движения, его спонтанность и импровизационность; понимание движения как средства выявления подсознательных импульсов; тесное взаимодействие движений тела и образов; выявление в хореографии памяти тела; принцип пространственной драматургии; преодоление понимания танца как иллюстрации музыки, эмоций, образа. Танец Буто нарушает каноны и традиции сценического искусства и раскрывает огромный потенциал развития новых театральных и хореографических форм.

Ключевые слова: танец Буто, белорусский пластический театр, современная хореография, телесная выразительность, принципы движения.

D. S. Skachkov

Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

BUTOH DANCE: BASIC PRINCIPLES AND THEIR REFLECTION IN THE CONTEMPORARY BELARUSIAN PHYSICAL THEATER

Butoh is an avant-garde dance style that originated in Japan in the early 1960s in the performances by Tatsumi Hijikata and Kazuo Ohno. Butoh offered radically new principles of choreography and relationship between the dancer and his own body, and innovative techniques of working with image and stage space. Among the main principles of Butoh, the following can be distinguished: the accentuation on the movement of the body, not on accurate choreography, the principles of "Empty Body" and body archeology, a borderline physical and mental condition of the actor and his body, the performer's radical subjectivity, an appeal to the creative powers of the subconscious, and the rejection of traditional concepts of harmony and beauty. Butoh started to be performed in Belarus in the early 2000s and now is a natural part of the stage practice of Belarusian dance groups and physical theatres, e.g.: Vyacheslav Inozemtsev's InZhest, a physical theatre, and independent choreographer Irina Anufrieva. The main aspects of Butoh that are focused by Belarusian theater directors and dancers are: meaningfulness, spontaneity and improvisation of movement, understanding movement as a means of revealing subconscious impulses, close interaction between bodily movements and images, revelation of bodily memory in choreography, the principle of spatial drama, overcoming the understanding of dance as an illustration of music, emotion, and image. Butoh breaks canons and traditions of dramatic art and reveals a huge potential for the development of new theatrical and choreographic forms.

Keywords: Butoh, Belarusian physical theater, modern choreography, bodily expression, movement principles.

Сучаснае сцэнічнае мастацтва характарызуецца пошукавай накіраванасцю ў спосабах і сродках выяўлення, наяўнасцю наватарскіх тэхнічных, стылявых і кампазіцыйных прыёмаў узаемадзеяння з прасторай і гледачом, складанай сінтэтычнасцю перфарматыўнай практыкі, якая ўключае ў сябе ў тым ліку ўзаемадзеянне і ўзаемапранікненне разнастайных пластычных і танцавальных методык і тэхнік.

© Скачкоў Д. С., 2017

Сярод актуальных стыляў танца, якія асабліва паўплывалі на светаўспрыманне, пластычную выразнасць і вобразнасць еўрапейскага і беларускага тэатральнага і харэаграфічнага мастацтва, варта адзначыць спецыфічна ўсходні стыль танца – танец Бута, які ўзнік у Японіі ў пачатку 1960-х гг. і быў перавезены ў Еўропу ў другой палове 1970-х гг. танцавальнымі групамі (у першую чаргу "Dairakudakan" (Даіракудакан), кіраўнік Акаджы Маро, "Sankai Juku" (Санкай Джуку), кіраўнік Ушыа Амагацу і асобнымі сола-танцорамі (такімі, як Ко Мурабушы).

У Беларусі танец Бута пачынае засвойвацца ў пачатку 2000-х гг. і на сённяшні час арганічна ўваходзіць у сцэнічную практыку айчынных харэаграфічных калектываў і пластычных тэатраў. Найбольш яскрава і паслядоўна танец Бута атрымлівае рэалізацыю ў творчай дзейнасці пластычнага тэатра "ІнЖэст" пад кіраўніцтвам В. Іназемцава і ў перформансах незалежнага харэографа І. Ануфрыевай, вучаніцы В. Іназемцава і шведскай «SU-EN Butoh Company», якая працуе ў Стакгольме і неаднаразова прывозіла свае сцэнічныя працы на мінскі фестываль пластычных і эксперыментальных тэатраў "ПлаSтформа".

Бібліяграфія, якая датычыцца даследавання пластычных і філасофскіх аспектаў танца Бута, у расійскіх і беларускіх выданнях прадстаўлена даволі сціпла. Адзінай друкаванай шырокадаступнай крыніцай на гэтую тэму з'яўляецца невялікі раздзел, прысвечаны танцу Бута, у кнізе В. Нікіціна "Энцыклапедыя цела: псіхалогія, псіхатэрапія, педагогіка, тэатр, танец, спорт, менеджмент" [1], дзе танец Бута разглядаецца як сродак тэрапеўтычнага пражывання вобразаў падсвядомага ў практыцы танцавальна-рухавай тэрапіі. На гэтым агульным малаінфармацыйным фоне даволі змястоўна выглядаюць інтэрнэт-артыкулы А. Васенінай [2], В. Ключаровай [3], Н. Калеснікавай [4], перакладныя артыкулы С. Кэйсукэ [5] і К. Тошыхару [6].

Манаграфіі замежных даследчыкаў, якія звярталіся да аналізу феномена танца Бута, вызначаюцца апісальным, суб'ектыўным характарам і не змяшчаюць тэарэтычных абагульненняў, што абумоўлена індывідуалізаванай прыродай танца Бута, якому не ўласціва строга вызначаная пластычная тэхніка. Так, даследаванне С. Ортан-Фралей "Танец у цемры. Бута, Дзэн і Японія" [7] мае эсэістычны характар і засяроджана на ўражаннях аўтара ад сустрэч, сумеснай творчай дзейнасці і прагляду сцэнічных прадстаўленняў славутых бута-танцоўшчыкаў, такіх як Кадзуо Она, Нацу Накаяма, Сабуро Тэшыгавара, Йоко Ашыкава, Мін Танака, Шодо Аканэ і Бута труп – "Ryokan" (Райакан) і "Sankai Juku". Праз эсэістычны расповед пра асобныя канкрэтныя праявы танца Бута аўтар фарміруе меркаванне пра феномен Бута як псіхафізічны механізм, з дапамогай якога акцёр-танцоўшчык максімальна паглыбляецца ў "цемру" самога сябе, у сусвет сваіх падсвядомых неадступных, навязлівых вобразаў і не імітуе, не пераймае іх пластычна, а праяўляе і візуалізуе іх цялесна, цалкам змяняючыся ўнутрана.

Праца гэтага ж аўтара, напісаная сумесна з бута-танцоўшчыкам, прафесарам Т. Накамурай "Тацумі Хіджыката і Кадзуо Она" [8], распавядае аб заснавальніках танца Бута, іх індывідуальных перажываннях і сцэнічных вобразах, што стварылі непараўнальны стыль руху і відазмянілі спосабы працы з целам і яго рэпрэзентацыі. Адзін з раздзелаў дадзенай кнігі "Танцавальны вопыт" з'яўляецца спробай фіксацыі практычных асноў танца Бута. Асноўны акцэнт зроблены на апісанні вобразаў і перадачы непасрэдных адчуванняў, якія прымушаюць цела зрабіць пэўны рух. Сістэма гэта не ўніфікавана, і кожны з танцораў Бута, якія ўзгадваюцца ў кнізе (Натсу Накаяма, Йошыто Она, Юміко Йошыока, Марыта Іта і Міка Такеўчы, Ацушы Такенаўчы), раскрывае свой уласны вопыт стварэння танца.

Тэрмін "Бута" ў перакладзе з японскага азначае "танец таптання", або "танец на месцы", і складаецца з двух іерогліфаў: "бу" азначае "танец", "я і тое, што вакол"; "то" – "тупаць", "надыходзіць". Кітайскі іерогліф "буі" азначае "круціцца" і "тэатр". На стыку гэтых сэнсаў і нараджаецца канцэпцыя танца Бута [2].

Танец Бута – авангардная, шокавая і эксцэнтрычная харэаграфічная форма. Гэта радыкальны танец, першапачаткова названы "Анакоку Бута", хаця пасля ў назве засталося толькі слова "Бута", інтэрпрэтаванае як танец. Сімвалічны ж сэнс быў закладзены ў слове "анакоку", якое літаральна азначае "цёмная чарнота" [8, с. 13]. Для японскай культуры класічная эстэтычная ўсталёўка, выкліканая гэтым словам, складаецца ў тым, што творчы працэс зараджаецца ў цемры. Цемра звязана з ідэяй пустэчы, з нічым, што з'яўляецца містычнай крыніцай энергіі

для чалавека, які займаецца мастацтвам. Цемра і пустэча ў гэтай эстэтыцы ўяўляюць большую цікавасць, чым святло і напоўненасць. Адсюль і з'яўляецца другая распаўсюджаная назва танца Бута – "Танец у Цемры". Гэтая ж назва найбольш ярка адлюстроўвае ўнутраную і вонкавую сутнасць самога Бута.

Слова "бута" таксама сугучнае і тэрміну "будо", які азначае мастацтва "воінскага шляху". «Мастацтва "будо" належыць да традыцый "дзэнскіх відаў барацьбы" і звязана з метафізікай даасізму, будызму, японскага дзэна і баявым мастацтвам Усходу. Магчыма, менавіта таму такога высокага майстэрства дасягаюць акцёры, фанатычна адданыя мастацтву Бута. Іх шматгадзінныя заняткі, татальнае адмаўленне ад культу агульнапрынятых сацыяльных каштоўнасцей падобны на трэнінгі і духоўныя практыкі дзэнскіх воінаў» [1, с. 543].

Бута як мастацтва сінтэтычнае нясе адбітак найбольш яркіх з'яў, якія існавалі падчас яго ўзнікнення. Даследчыкі разыходзяцца ў вылучэнні першакрыніцы танца Бута. Адны называюць крыніцамі Бута сюррэалізм і дадаізм. Другія бачаць зараджэнне гэтага танца ў сутыкненні японскага танцавальнага мастацтва з экспрэсіяністычным харэаграфічным мастацтвам Заходняй Еўропы, прадстаўленым Мэры Вігман [9]. Трэція звязваюць яго з'яўленне з імем эпатажнага пісьменніка і драматурга Юкіа Місімы. Несумненным з'яўляецца таксама і актыўны ўплыў на Бута традыцыйных класічных формаў тэатральнага мастацтва Японіі, такіх як Ногаку, Кабукі і Но, традыцыйных японскіх паэтычных формаў – трохрадкоўяў хоку і класічнай японскай гравюры на дрэве Юкіа-э [7, с. 10]. Вялікі ўплыў на Бута зрабілі і сацыяльныя працэсы: наступствы атамных выбухаў у Хірасіме і Нагасакі, а таксама звязаныя з паражэннем у Другой сусветнай вайне галеча і голад. Прынцыпова важна адзначыць тое, што ў танцы «сутыкнуліся дзве культуры: з аднаго боку – традыцыйна японскі падыход да мастацтва і тэатра, з другога – заходнія формы вольнага танца, тэатр "абсурду", тэатр "жорсткасці", хэпенінгі і перформансы» [10]. Менавіта з гэтага "сутыкнення" і нарадзіўся своеасаблівы сплаў танца Бута – не японскі і не еўрапейскі тэатральна-харэаграфічны эксперымент, а феномен агульнасусветнага маштабу: "У спробе вырашыць канфлікт паміж традыцыйным і рэвалюцыйным – паміж класічным танцам, артадаксальнымі нормамі этыкі і авангардам – нарадзіўся не проста танец, а новая філасофія цялеснага быцця" [1, с. 542].

"Няма ніякай філасофіі, папярэдняй Бута. Але існуе філасофія, якая зыходзіць з Бута", – адзначаў Т. Хіджыката [6]. В. Іназемцаў гэтую філасофію руху вызначае так: "Бута, перш за ўсё, мае на мэце ўнутранае абгрунтаванне руху, зыходзячы з таго, што чалавек рухаецца не таму, што трэба рухацца, а таму, што адчувае ўнутраную сувязь з сусветам, падзеямі і гэта актывізуе яго да руху. Справа не ў тым, умее чалавек сядзець на шпагаце ці стаяць на галаве, а ў тым, што яго да гэтага падахвочвае" [11]. Заходняя культура, у адрозненне ад усходняй, заўсёды ўсведамляла сябе як культуру, якой неабходна няспыннае развіццё і рух наперад. Гэта датычыцца ўсёй разнастайнасці формаў чалавечай дзейнасці, уключаючы і сцэнічную дзейнасць. Эстэтыка танца на Захадзе такім жа чынам схільна да гэтай заканамернасці: танец вызначаецца як рух чалавечага цела, бесперапынная змена становішча ў прасторы і стану цела. З цягам часу ў гэтым танцы змяняюцца толькі тэхнікі выканання рухаў цела і спосабы перасоўвання. Танец Бута здзейсніў рэвалюцыйны пераварот у такім падыходзе, зрабіўшы адмысловы акцэнт не на рух цела, а на само цела. Цела і яго рэальнае існаванне ў прасторы – вось што сапраўды важна для Бута. Па словах В. Іназемцава, "Бута прадугледжвае іншы падыход да танца ў прынцыпе. Гэта датычыцца і асноўнага матэрыялу тэатра – цела, і адносін да сусвету, да драматургіі, да выразных сродкаў. Усё тут накіравана на разняволенне падсвядомых імпульсаў, на актывізацыю здольнасці агаліць спантанныя рэакцыі цела. У выніку ўзнікае шмат нестандартных пластычных вырашэнняў, што істотна адрозніваe Бута ад еўрапейскай сістэмы танца і класічнай пантамімы" [10].

Прыярытэт цела ў пластычным выяўленні танца Бута стварае адметную мадэль узаемадзеяння акцёра і вобраза, фізічнага развіцця вобраза ў целе. У адрозненне ад драматычнага тэатра або тэатра пантамімы, дзе вобраз першапачаткова дакладна вызначаны і ўсталяваны цялесныя формы яго ўвасаблення, у танцы Бута вобраз ёсць толькі падстава, зыходны імпульс для пачатку руху і выражэння. Пераадолеўшы спакой і пачаўшы рух, цела пачынае нараджаць усё новыя і новыя вобразы, якія вынікаюць з самога руху. Вобразы, якія выяўляюцца фізічна, не асэнсоўва-

юцца і не ўсведамляюцца акцёрам, а з'яўляюцца тварэннем цялеснай кінетычнай змены. У танцы Бута працэс развіцця вобраза ёсць непасрэдна сам працэс руху. Да першапачатковай выявы ў працэсе руху дадаюцца матывы іншых выяў і матывы іх фізічнай рэалізацыі, а з руху вырастае новы вобраз, надзелены фізіялагічнай спецыфікай. Выява нараджае рух, рух нараджае выяву і гэтак да бясконцасці.

Танцор Бута рухаецца ў адпаведнасці са сваёй унутранай мэтай, выконвае тое, што яму дыктуецца знутры, адказвае на патрабаванні свайго цела. Цела яго не падкантрольнае свядомасці і не паддаецца валявому ўздзеянню і кіраванню самім танцорам. Так, у аснову Бута закладваецца прынцып "пустога цела" ("hokotai" ці "zerowalk"), цела бязвольнага, але гатовага ўпусціць у сябе цэлы сусвет, а затым даць яму магчымасць бесперашкодна выявіцца, матэрыялізавацца. Калі чалавек рухаецца, трэба зразумець, што ім рухае, адкуль ён пачынае рухацца. Каб наблізіцца да сапраўднага руху, трэба зыходзіць з таго, што цела наогул не здольнае рухацца, неабходна прыйсці да нуля, мінімізавацца, пазбавіцца ад усіх страховак, прынад і штампаў. Цела танцора прыпадабняецца жбану, які трэба спустошыць, вызваліць ад усяго асабістага, каб напоўніць яго чымсьці чужым, іншародным, ці гэта будзе дух дрэва, сухога ліста, старой жанчыны. Прынцып "пустога цела" сугучны ўсходняму імкненню да абязлічвання, што зусім не азначае зліццё з шэрай масай і знішчэнне індывідуальнасці. Абязлічыцца – значыць цалкам зліцца з навакольным светам, "з прыродай, ветрам, дрэвамі, вадой, здабыць гармонію яднання з усім існым, з тым, адкуль мы прыйшлі і куды сыдзем. Ідэал для Бута – перастаць быць чалавекам, калі танцуеш" [3]. Такі "нечалавечы" танец пазбаўляецца ад якіх-небудзь упрыгожанняў, а прыгажосць цела перастае мець хоць якое-небудзь значэнне. "У Бута, заснаваным на вонкавым выяўленні ўнутраных перажыванняў, вельмі важна максімальна разняволіць свядомасць для імпульсаў цела, не ацэньваць свае дзеянні з пункта гледжання прыгажосці і наогул эстэтыкі", – сцвярджае В. Іназемцаў [9].

Бута з'яўляецца таксама вынікам ідэі, якая складаецца ў тым, што кожны танец змяшчае ў сабе сапраўднае і поўнае адлюстраванне цялеснай памяці і ўспамінаў [12], у сувязі з чым вылучаецца аспект "археалогіі цела" – гэта значыць "адкопванне" таго, што пахавана глыбока ў целе: яго эмоцыі, нерэалізаваныя рухі. "Маё цела, памяць змяшчаюць інфармацыю аб тым, з чым я працую. У сваіх перформансах я раблю сумленную спробу даць гэтаму загучаць", – адзначае І. Ануфрыева [13]. Бута дазваляе чалавеку пражываць яго ўласныя, натуральна ўзнікаючыя эмоцыі: гнеў, дэпрэсію, гора, страх, радасць. Праз фізічныя спантанныя рэакцыі (спазмы, некантралюемыя паторгванні, трэмар, скажэнні твару і цела, падзенні на падлогу, тупанне нагамі – усялякую "дэканструкцыю руху") Бута дазваляе выяўляць тыя ўтоеныя эмоцыі, якія недапушчальна паказваць у звычайных сацыяльных умовах. Бута таксама дае магчымасць эстэтычным і духоўным пачуццям выйсці на паверхню, дапамагае ім выбрацца з забытых, прыгнечаных пластоў усведамлення, і гэта з'яўляецца катарсісам, вопытам ачышчэння душы як у танцора, так і ў гледача.

Для Бута характэрна і цалкам адмысловае стаўленне да навакольнай прасторы. Танцор Бута як быццам "прыслухоўваецца" да яго, імкнецца адчуць атмасферу, насычаную нябачнымі токамі і шматлікімі імпульсамі. Усходняя "ўключанасць" чалавека ў навакольны свет, супрацьпастаўленая заходняму прынцыпу трансфармацыі асяроддзя пад неабходнасці чалавека, уводзіць прастору ў танец Бута, як аднаго з асноўных герояў прадстаўлення. Гэта канцэпцыя была асэнсавана В. Іназемцавым у прынцыпе прасторавай драматургіі, які стаў адным з асноўных метадаў пабудовы спектакля тэатра "ІнЖэст" і самым упадабаным прыёмам арганізацыі тэатральнай дзеі. Паводле гэтага прынцыпу дзеянне спектакля нараджаецца пад уплывам асаблівасцей навакольнай прасторы, яе архітэктуры і архітэктонікі. Неардынарнасць сцэнічнай прасторы, яе планавы патэнцыял, магчымасць арганічнага кантакту з ёю вызначаюць усю вонкавую і змястоўную структуру спектакля.

Свабода вонкавага выяўлення, якая дазваляе выкарыстаць любыя пластычныя тэхнікі і прыёмы ад класічнага танца да танца мадэрн, і поўная свабода ўнутранага выяўлення індывідуальнай вобразнасці даюць Бута бязмежныя магчымасці для імправізацыі. Адна з асноўных ідэй танца Бута сцвярджае, што "харэаграфія не павінна ператварацца ў сістэму, у раз і назаўжды ўсталяваны набор камбінацый і па" [14]. Танцоры ствараюць свой індывідуальны танец ніяк не фіксаваны, кожны раз новы. "Танец гэты ні на што не накіраваны. Ён нараджаецца і памірае

разам з вечна бягучым часам. Будучыня не цікавіць стваральніка танца Бута. Чалавек жыве толькі імгненнямі сучаснасці, якія бесперапынна нараджаюцца і паміраюць", – сцвярджае В. Ключарова, падкрэсліваючы індывідуальны падыход танцора ў стварэнні танца Бута [3]. Менавіта гэта робіць танец Бута той актуальнай формай мастацкага акта, шчырага, праўдзівага існавання акцёра "тут і зараз" (hic et nunc), які шукае сучасны тэатр.

Імправізацыя, вольны выраз пачуццяў і эмоцый праз уласнае цела, у якім вібруе кожны нерв і танцуе кожная цягліца, як гэта ні парадаксальна, магчымы толькі ў добра падрыхтаваным целе, што робіць танец Бута тэхнічна складаным, танцам унутранага і вонкавага напружання, патрабавальным як да фізічнай, так і псіхалагічнай падрыхтоўкі выканаўцы. Кантралюемае напружанне, якое даводзіць чалавека да грані магчымасцей яго цела, з'яўляецца адным з метадаў, пры дапамозе якога акцёры будуюць сваю сцэнічную працу. Цела, даведзенае да мяжы магчымасцей (напружання, расслаблення, расцяжэння, сціску), у любых памежных сваіх праявах, па-першае, выяўляе неверагодныя магчымасці цялеснай выразнасці, а па-другое – дае непасрэдны доступ да закрытых у звычайным, штодзённым існаванні зон псіхікі, адкрываючы неверагодныя гарызонты для духоўнай выразнасці. Вонкава дзеянні акцёраў выглядаюць як выпадковае, бессэнсоўнае поўзанне, скачкі, падзенні і кульбіты ці, наадварот, нерухомае ляжанне на сцэне, але ўсё гэта – "нейкі транс, адключэнне ад прытомнасці, для таго, каб ісці самім і весці гледача да непазнанага, для таго, каб абудзіць у гледача эмацыянальны водгук і выбух" [15, с 26].

Бута – танец, які ламае і парушае каноны і традыцыі, танец які выкарыстоўвае адмысловы псіхафізічны стан цела выканаўцы для стварэння неардынарнай, выключнай сцэнічнай рэальнасці. Бута – свабодны танец, які ў значнай ступені мае справу з несупыннай усеагульнай трансфармацыяй, што раскрывае велізарны патэнцыял развіцця новых форм і сэнсаў, якія жыццёва неабходны, у тым ліку і для стварэння актуальнага беларускага тэатральнага і харэаграфічнага мастацтва.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Никитин, В. Н. Энциклопедия тела : психология, психотерапия, педагогика, театр, танец, спорт, менеджмент / В. Н. Никитин. – М. : Алетея, 2000. – 624 с.

2. Васенина, Е. Закатать в Буто, или так сказал Хидзиката / Е. Васенина // ZAART [Электронны рэсурс]. – 2006. – Рэжым доступу : http://mmj.ru/index.php?id=161&article=633.

3. Ключарева, О. О некоторых сторонах Японской "Новой Волны", которая, в сущности, не так нова / О. Ключарева // Окно в Японию [Электронны рэсурс]. – 2003. – Рэжым доступу : http://ru-jp.org/klyuchareva01.htm.

4. Колесникова, Н. О чем молчат движения / Н. Колесникова // Первый глобальный портал о музыкальной и около культурной жизни городов России [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.back-stage.ru/report/teatr-tipo/0003.

5. Кэйсукэ, С. Буто – тело как искусство / С. Кэйсукэ // " Современный танец" [Электронны рэсурс]. – 1999. – № 11. – Рэжым доступу : http://www.iatp.md/contemporarydance.html.

6. Тошихару, К. Танец Буто как метод психосоматического исследования / К. Тошихару [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://girshon.ru/article/tanets-buto-kak-metod-psihosomaticheskogo-issledovaniya-toshiharu-kasai.

7. Fraleigh, S. Dancing into darkness. Butoh, Zen, and Japan / S. Horton Fraleigh. – University of Pittsburgh Press and Dance Books Ltd., 1999. – 267 p.

8. Fraleigh, S. Hijicata Tatsumi and Ohno Kazuo / S. Fraleigh, T. Nakamura. – Padstow; Cornwall : Book Now Ltd and TJ International Ltd, 2006. – 180 p.

9. Завадская, И. В театральных буднях – праздник буто / И. Завадская // Советская Белоруссия [Электронны рэсурс]. – 2002. – № 137. – Рэжым доступу : http://tv.sb.by/kultura/article/v-teatralnykh-budnyakh-prazdnik-buto.html?AJAX_MONTH=2&AJAX_YEAR=2016.

10. Коломенская, И. Танцевальный дуэт Востока и Запада / И. Коломенская // БДГ [Электронны рэсурс]. – 1999. – № 6. – Рэжым доступу : http://bdg.press.net.by/1999/1999_04_02.569/japan.shtml.

11. Матяс, И. Проводы зимы на "Елке У" / И. Матяс // БДГ [Электронны рэсурс]. – 2001 – № 5. – Рэжым доступу : http://www.belgazeta.by/ru/2001_02_05/obschestvo/2001.

12. Bergmark, J. Butoh – revolt of the flesh in Japan and a surrealist way to move / J. Bergmark // Mannen pagatan [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.surrealistgruppen.org/bergmark/butoh.html.

13. Улановская, С. Вначале было тело / С. Улановская // ArtAktivist [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://artaktivist.org/theatre/vnachale-bylo-telo

14. Мелкумова, Я. Душевная техника Мин Танака / Я. Мелкумова // PRO ART Культурная журналистика [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://proarte.spb.su/ru/programm/art-jurnal/reviews?id=385.

15. Вавілава, Н. Анатомія ІнЖэста / Н. Вавілава // Мастацтва. – 2006. – № 7. – С. 26–27.

References

1. Nikitin V. N., Entsiklopediia tela: psikhologiia, psikhoterapiia, pedagogika, teatr, tanets, sport, menedzhment [Encyclopedia of Body: Psychology, Psychotherapy, Pedagogy, Theatre, Dance, Sports, and Management], Aleteia, Moscow, RU, 2000.

2. Vasenina E., "Roll in Butoh, or Thus Spoke Hijikata", ZAART, 2006, available at: http://mmj.ru/index.php?id=161&article=633, (Accessed 05.04.2016).

3. Kliuchareva O., "On Certain Aspects of the Japanese 'New Wave' Which is Per Se Not That New", Okno v Iaponiiu [Window to Japan], 2003, available at: http://ru-jp.org/klyuchareva01.htm, (Accessed 05.04.2016).

4. Kolesnikova N., "What Movements are Silent About", Pervyi global'nyi portal o muzykal'noi i okolo kul'turnoi zhizni gorodov Rossii [The first global portal on the musical and cultural life of Russian cities], available at: http://www.back-stage.ru/report/teatr-tipo/0003, (Accessed 05.04.2016).

5. Keisuke S., "Butoh: Body as Art", " Sovremennyi tanets" ["& Nbsp Modern Dance"], available at: http://www.iatp.md/contemporarydance.html, (Accessed 05.04.2016).

6. Toshikharu K., "Butoh Dance as a Method of Psychosomatic Study", available at: http://girshon.ru/article/tanets-buto-kak-metod-psihosomaticheskogo-issledovaniya-toshiharu-kasai, (Accessed 05.04.2016).

7. Fraleigh S., Dancing into Darkness. Butoh, Zen, and Japan, University of Pittsburgh, Pittsburgh, US, 1999.

8. Horton Fraleigh S., Nakamura T., Hijikata Tatsumi and Ohno Kazuo, Routledge, New York, US, 2006.

9. Zavadskaia I., "A Feast of Butoh in Theatrical Routine", Sovetskaia Belorussiia [Soviet Belarus], 2002, no. 137, available at: http://tv.sb.by/kultura/article/v-teatralnykh-budnyakh-prazdnik-buto.html?AJAX_MONTH=2&AJAX_YEAR=2016, (Accessed 05.04.2016).

10. Kolomenskaia I., "A Dancing Duo of the East and West", BDG, 1999, no. 6, available at: http://bdg.press.net.by/1999/1999_04_02.569/japan.shtml, (Accessed 05.04.2016).

11. Matias I., "Bidding Farewell to Winter at Yolka U", BDG, 2001, no. 5, available at: http://www.belgazeta.by/ru/2001_02_05/obschestvo/2001, (Accessed 05.04.2016).

12. Bergmark J., "Butoh – Revolt of the Flesh in Japan and a Surrealist Way to Move", Mannen pagatan, available at: http://www.surrealistgruppen.org/bergmark/butoh.html, (Accessed 05.04.2016).

13. Ulanovskaia S., "In the Beginning was the Body", ArtAktivist, available at: http://artaktivist.org/theatre/vnachale-bylo-telo, (Accessed 05.04.2016).

14. Melkumova Ia., "Min Tanaka's Soul Technique", PRO ART Kul'turnaia zhurnalistika [PRO ART Cultural Journalism], available at: http://proarte.spb.su/ru/programm/art-jurnal/reviews?id=385, (Accessed 05.04.2016).

15. Vavilava N., "Anatomy by InZhest", Mastatstva [Art], 2006, no. 7, pp. 26–27.

Информация об авторе

Скачков Дмитрий Сергеевич – канд. искусствоведения, мл. науч. сотрудник. ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : bttpervii@gmail.com.

Information about the author

Skachkov Dmitri Sergeevich, Ph. D. (Art Hist.), Junior Researcher, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: bttpervii@gmail.com.

Для цитирования

Скачкоў, Д. С. Танец Бута : асноўныя прынцыпы і іх асэнсаванне ў сучасным беларускім пластычным тэатры / Д. С. Скачкоў // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 76–81.

For citation

Skachkov D. S. Butoh Dance: Basic Principles and Their Reflection in the Contemporary Belarusian Physical Theatre. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 2, pp. 76–81.

ISSN 0321-1649 (print)
УДК 398.332.47(=161.3)

Паступіў у рэдакцыю 18.10.2016
Received 06.09.2016

А. І. Ляшкевіч

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

ТЭМЫ ПРОВАДАЎ ЗІМЫ І СУСТРЭЧЫ ВЯСНЫ Ў МАСЛЕНІЧНЫХ АБРАДАХ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ

Мотивы проводов зимы и кликанья весны в масленичных обрядах белорусского Полесья проанализированы с использованием этнолингвистической методологии. Масленица рассматривается как один из праздников весеннего новолетия, ритуал перехода (в терминологии Арнольда ван Геннепа). В качестве ступеней перехода выделяются проводы зимы и кликанье весны. Использованы также наработки А. К. Байбурина, который уточняет выделенные ван Геннепом этапы в ритуале: «старый мир», который существовал до проведения ритуала, десемиотизируется; затем происходит создание новой семиосферы, собирание «нового мира» из обособленных частей; в конце ритуала – освоение созданного заново мира, его ритуальный раздел. Символический «старый мир», старый сезон в масленичных обрядах – это зима, а новый – весна.

Проводы зимы и кликанье весны в полесской масленичной обрядности рассматриваются во взаимосвязи. Анализируются такие аспекты проводов зимы на Полесье, как сжигание чучела, ветоши, демонстрация специально сделанной куклы-чучела. Акцентируется внимание на таких особенностях масленичного кликанья весны, как исполнение весенних песен возле костра, в котором жгут чучело или ветошь, локально (Житковичский и Столинский р-ны) – кликанье весны с сыром в руках.

Ключевые слова: Масленица, проводы зимы, кликанье весны, Полесье, ритуал перехода, весеннее новолетие.

Ye. I. Leshkevich

Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

MOTIVES OF BIDDING FAREWELL TO WINTER AND GREETING SPRING IN SHROVETIDE RITES IN BELARUSIAN POLESIE REGION

The motives of bidding farewell to winter and calling for spring in Shrovetide rites in Belarusian Polesie are analyzed using ethnolinguistic methods. Shrovetide is considered as a springtime new year holiday – a rite of passage (as defined by Arnold van Gennep). The bidding farewell to winter and calling for spring are distinguished as phases of passage. The article also uses research results by Albert Baiburin who updates van Gennep's rite phases: the "old world" that existed before the rite is desemiotized; then a new semiosphere is created – a "new world" is gathered together of detached parts; the world created anew is explored and is ritually divided in the end of the rite. The symbolic "old world," i.e. the old season, in Shrovetide rites is winter, with spring being a new one.

Bidding farewell to winter and calling for spring Shrovetide rites in Polesie region are considered in their interrelationship. Such aspects of bidding farewell to winter in Polesie as burning a dummy and rags and demonstrating a specially made doll are analyzed. A focus is made on such specific features of calling for spring during Shrovetide as singing spring songs by the bonfire of the dummy or rags, and (locally, in Žytkavičy and Stolin Districts) calling for spring with a piece of cheese in one's hands.

Keywords: Shrovetide, bidding farewell to winter, calling for spring, Polesie, the rite of passage, springtime new year.

Масленіца ўваходзіць у шэраг абрадавых комплексаў, якія пазначалі старажытнае вясновае навалецце. Асобныя элементы абраднасці, якія ў адной мясцовасці прымеркаваны да Масленіцы, у другой могуць суадносіцца з іншым святам ці перыядам: пачатак спявання і выкананне пэўнага віду вясновых песень, ваджэнне карагодаў, провады зімы, рытуал прасіць даравання ў родных. Гэта сведчыць пра "расцягванне" вясновага навалецця. Як піша Т. А. Агапкіна, "практычна ўсе ранневясновыя даты (як фіксаваныя, так і пераходныя) літаральна насычаны ініцыяльнай сімволікай, што маркіруе канец старога і пачатак новага каляндарнага перыяду і звязана з ідэямі абнаўлення, пачатку, маладосці…" [1, с. 152].

Масленіца як адно са свят навалецця належыць да рытуалаў пераходу (у тэрміналогіі Арнольда ван Генэпа), для якіх характэрна паслядоўная змена прэлімінальнай, лімінальнай і постлімінальнай фаз. Такая трохчасткавая структура рытуалу мае ўнутраную сувязь, што фарміруецца ў сюжэт пераходу. Ван Генэп падкрэсліваў, што ў кожным асобна ўзятым рытуале гэтыя тры этапы могуць

© Ляшкевіч А. І., 2017

быць няроўныя па значнасці і ступені распрацоўкі. Ван Генэп адносіў да рытуалаў пераходу абрадавыя комплексы, звязаныя з жыццёвым цыклам чалавека, а таксама рытуалы, звязаныя са зменай касмічных з'яў: фаз Месяца, пор года [2]. Згодна з высновамі А. К. Байбурына, любы каляндарны рытуал з'яўляецца рытуалам пераходу і праводзіцца для таго, "каб адзін перыяд (сезон) змяніўся іншым". Даследчык удакладняе выдзеленыя ван Генэпам этапы ў рытуале: дэсеміятызацыя свету, сітуацыя распаду, нераздзельнасці (прадстаўнікі іншасвету аказваюцца сярод людзей, а праявы жыццядзейнасці апошніх зводзяцца да мінімуму); стварэнне новай семіясферы, збіранне "новага свету" з адасобленых частак; засваенне створанага наноў свету, яго рытуальны падзел, размеркаванне долі між удзельнікамі рытуалу, у т. л. прадстаўнікамі іншасвету [3, с. 149–150]. Сімвалічны "стары свет", стары сезон у масленічных абрадах – гэта зіма, а новы – вясна.

Провады зімы. Для завяршэння каляндарных перыядаў характэрна сімволіка выправоджвання, з якой І. А. Марозаў і І. С. Сляпцова звязваюць паленне вогнішчаў на Масленіцу [4, с. 295]. У якасці ўвасаблення зімы падчас беларускіх масленічных абрадаў часам згарае антрапаморфнае пудзіла, найчасцей у жаночай іпастасі. Антрапаморфнае пудзіла як каляндарны сімвал[2] Масленіцы сустракаецца ў рускіх, у Харватыі, Славеніі, Польшчы, Славакіі, Чэхіі [1, с. 583–592]. В. К. Сакалова вылучае ў рускіх два асноўныя тыпы провадаў Масленіцы: вогнішчы і праводзіны-пахаванні абрадавага пудзіла. Даследчыца прыходзіць да высновы, што звычай паліць вогнішчы на Масленіцу быў агульнарускі, распаўсюджаны ў т. л. у Пскоўскай і Смаленскай губернях. Праводзіны-пахаванні масленічнага пудзіла характэрны для Рускай Поўначы [5, с. 17–18]. Заўважым, што ў склад Пскоўскай і Смаленскай губерняў уваходзілі і беларускія этнічныя тэрыторыі (па картах рассялення беларусаў М. В. Доўнар-Запольскага і Е. Ф. Карскага) [6, с. 76]. Т. А. Агапкіна піша, што спальванне пераважала як форма пазбаўлення ад масленічнага сімвала ў рускіх, што звязвае з сумяшчэннем у рускай Масленіцы традыцый вырабу каляндарнага сімвала і распальвання вогнішчаў [1, с. 586].

Спальванне пудзіла выступае кульмінацыяй амаль любога сучаснага святкавання Масленіцы ў Беларусі, гарадскога і сельскага. Між тым, зусім няшмат этнаграфічных крыніц сведчаць аб даўнейшым бытаванні звычаю спальвання масленічнага пудзіла на тэрыторыі Беларусі (мал. 1).

Адзін з арэалаў спальвання масленічнага пудзіла складае ўсходняе Палессе. Звесткі сустракаюцца ў вёсках Нісімкавічы Чачэрскага р-на [7, с. 567], Буркі Брагінскага р-на [8, с. 161], Залессе Добрушскага р-на [9, с. 219], Настолле (цяп. г. Хойнікі) Хойніцкага р-на [10, с. 78], Свіднае Лельчыцкага р-на[3]. У цэнтральнабеларускім рэгіёне згадкі спальвання пудзіла сустракаюцца ў Любанскім [11, с. 121–122; 12, с. 149] і Бярэзінскім[4] р-нах. Варта адзначыць, што Любанскі р-н па асаблівасцях традыцыйнай культуры знаходзіцца на мяжы гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Усходняга Палесся. З. Я. Мажэйка адзначала: "Палескі спеўны стыль ахоплівае цэнтральныя раёны Беларусі (прыкладна да лініі Клецк – Бабруйск)" [13, с. 5]. Бярэзінскі ж р-н уключаюць у т. зв. "Малое Палессе" – рэгіён паміж рэкамі Бярэзіна і Друць[5].


Сустракаюцца звесткі пра выраб пудзіла без яго спальвання. У в. Будча Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. на Масленіцу абыходзілі дворы з лялькай: «*Носім ужо тую Немку... перад постам, ці ў нядзелю, ці ў суботу... Падругі мы, дзяўкі, дзяўчата, прыбяром, бы кукалка… на качалацы… бы сукеначка якая, да бы касынічкі, бы дзевачка яна была. Ліцо беленьке рабілі, галоўку прыстройвалі, нешта рысавалі, бы вочы, ды й носік, бы дзіцятко якое. А тут ужо сукеначка ды хустачка. Ці валена <вэлюм> рабілі. А тут каўнерчыка харошага, кругленькага з каруначкамі кругом ужэ. Кажны гурт насіў сваю <Немку>. Хадзілі па хатах, дый давалі нам ужо хто што дась. Казалі:*

[2] Згодна з Т. А. Агапкінай, каляндарныя сімвалы – гэта антрапа-, арніта-, ці фітаморфныя «рэчавыя» сімвалы, якія адлюстроўваюць міфапаэтычную семантыку каляндарнага часу [1, с. 578–579].

[3] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. у пас. Крупскі Крупскага р-на Мінскай вобл. ад Касінскай (дзяв. Бжэзіцка) Антаніны Адамаўны, 1941 г. н., нар. у в. Свіднае Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

[4] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2015 г. у в. Чыжаха Бярэзінскага р-на ад культработніцы Карканіцы (дзяв. Пікарэвіч) Кацярыны Уладзіміраўны, 1957 г. н., нар. у в. Прыцерпа Бярэзінскага р-на, у Чыжасе жыве з 1984 г.

[5] У склад Малога Палесся ўваходзяць лясістыя часткі Барысаўскага, Лепельскага, Чашніцкага, Талачынскага, Круглянскага, Бялыніцкага і Крупскага р-наў, па прыродных асаблівасцях рэгіён нагадвае Вялікае Палессе [14].



Мал. 1. Спальванне масленічнага пудзіла на тэрыторыі Беларусі

Fig. 1 . Burning Shrovetide Dummy in Belarus

“Немку носім, сала просім, на Запускі – па два кускі,па тры кускі”»[1]. Па іншых звестках, з Немкай хадзілі толькі да бабылёў з мэтай падабраць ім нявесту [16, с. 34–35]. Звяртае на сябе ўвагу “немата”, што прыпісваецца ляльцы ў Будчы і адлюстроўваецца ў яе імені: *“<Чаму яна Немкай звалася?> Мо не гаварыла. Нейка дзеўка”*[2]. У в. Тонеж Лельчыцкага р-на на Масленіцу цяпер робяць пудзіла ў жаночай іпастасі*. Перад тым, як спаліць, замазваюць пудзілу галавешкай твар, прыгаворваючы: *“Ну шо, замазуем ей вочы, хай на нас не глядзіць, хай ужо весна к нам ідзе!”*[3] Калі ўвасабленне зімы невідушчае, сімвалічна паслабляецца яго ўплыў, вызваляецца дарога вясне, кажуць: *“Усё, горыць зіма!”*[4]. Слепата пудзіла з Тонежа і немата Немкі з Будчы сімвалічна набліжаюць масленічную ляльку да тагасвету, раскрываюць яе медыятыўны характар. Да таго ж імя Немкі магло пазначаць яе статус “чужой” для вясковага соцыуму.

Дэманстраванне масленічнага пудзіла без згадкі яго спальвання сустракаецца ў в. Ленькі Слуцкага р-на, на мяжы з Палессем: *“На Масьленку каня запрагуць і ўсягда каталіся. А то пасадзяць жанок – да мужчыны возьмуць санкі і жанчын возяць па сяле. А то чучала змайструюць: які андарак возьмуць на палачку, да хусту закруцяць – і вязуць”*[5] [11, с. 118]. Невядома, што рабілі з масленічнымі лялькамі ў Будчы і Леньках пасля свята. Магчыма, іх чакала “нату-

[1] Зап. М. Лук’янава, А. Варахоб і Н. Гвоздзева ў 2015 г. у в. Будча Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ад Савені Надзеі Матвееўны, 1932 г. н., правасл., мясц. [15].

[2] Зап. М. Лук’янава, А. Варахоб і Н. Гвоздзева ў 2015 г. у в. Будча Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ад Савені Надзеі Матвееўны, 1932 г. н., правасл., мясц. [15].

* Недастаткова звестак, каб з упэўненасцю сцвярджаць існаванне звычаю ў мінулым.

[3] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2014 г. у в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Карась Марыі Іванаўны, 1958 г. н.

[4] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2014 г. у в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Карась Марыі Іванаўны, 1958 г. н.

[5] Зап. у в. Ленькі Слуцкага р-на Мінскай вобл. ад Марыі Дробыш, 1920 г. н.

ральная смерць", якую Т. А. Агапкіна прыводзіць як адзін з варыянтаў завяршэння жыццёвага цыкла каляндарнага сімвала нароўні з яго знішчэннем шляхам спалення, закопвання, патаплення, выкідання і г. д. [1, с. 578].

У в. Закальное Любанскага р-на: *«От хто зробіць дома пудзіло, ці на палкі абвітыя саломаю жаночу адзежу надзявалі, ці от просто на сухую галіну, дажэ хустку завяжуць. І з тым пудзілам хадзілі па ўсему селу. Людзі выходзілі і павязвалі такіе істужачкі із крамы, казалі "грахі павязваць". Занясуць тое пудзіло за сяло і спаляць»*[10] [11, с. 121]. Павязваннем стужачак на пудзіла вяскоўцы фактычна ўдзельнічалі ў яго стварэнні. На тое, што пудзіла робіцца ўскладчыну, звяртае ўвагу даследчык А. К. Байбурын. Такое "збіранне" каляндарнага сімвала ён звязвае з "сімволікай збірання свету, які распаўся" ў перыяд, які папярэднічае здзяйсненню рытуалу [3, с. 133, 139].

Масленічных лялек, прызначаных як для спальвання, так і для закопвання, часта выраблялі з саломы [8, с. 161; 17, с. 66; 11, с. 121[11]; 18[12]], якая ў народна-міфалагічных уяўленнях беларусаў судачыняецца з ураджаем і ў той жа час са светам продкаў [19, с. 448]. Салома, старое адзенне, што выкарыстоўвалі для вырабу масленічных лялек, выразна паказваюць, з аднаго боку, на "нямогласць" старога сезона, што саступае правы, адыходзіць, памірае. З другога боку, старасць і смерць змяшчаюць інтэнцыю да адраджэння ў новай форме: попел пасля спальвання пудзіла рассыпаюць па палях, што павінна спрыяць добраму ўраджаю [7, с. 567; 10].

Замест пудзіла на Масленіцу маглі паліць старыя рэчы, кастрыцу, салому [11, с. 121] – дзеянне мае тую ж семантыку, што і спальванне пудзіла. Палячы старызну на Масленіцу, у в. Опаль Іванаўскага р-на прыгаворвалі: *"Ідэ зіма до тучы, берэ постолы і ганучы"* [20, с. 160]. У в. Моталь таго ж раёна з падобнымі прыгаворкамі выганялі зіму на Масленіцу, стукаючы кіямі: *«Ходылы хлопцы с кіямі, стукалы, крычалы: "Ходы, зіма, до Кучова, бо ты нам надокучала". Шлы, кіямі трахалы і трахалы. Кучова – это сіло дальшэ. В каждой вулыцы своі хлопцы, зборня была»*[13] [21, с. 98]. Такое выгнанне зімы знайшло адлюстраванне ў "гукальных" песнях: *"Ой, Маслянка-несчаслянка, сера вутка. У!/Ты ж казала, вясна скора, да й няхутка. У!/ Праводзім зіму з качаргамы, У!/Сустрэнім вясну з пірагамы, У!"*[14] [22, с. 59, 131, 150].

На паўночным усходзе Брэстчыны провады зімы з падобнымі прыгаворкамі адбываліся на Фаміным тыдні [21, с. 124–126]: *«Радуніца ва вторнік после Правадной недзелі, а в нас обязацельна в понедзельнік вечерам ужэ маці готуе вэчэру шо найсмачнейшу... повечэралі, пойілы і вжэ господыня, і дыты, всі, бяруць хто дыркача, хто лопату, хто эту гачку, хто вылкы і вжэ із-под коёк, із-под лавок выгоняюць: "Іды, Зыма, од нас, іды до Кучава, бо ты нас всіх помучыла!", "Іды, Зіма, до Кракова, чэрэз год прыйдэш до нас однаково!" І ту Зіму выганяюць і жэнут ее, ну, як есьць такое небольшое азерцэ ці якая рэчанька блізко, то туды. І вжэ гэто шо дзержаць, ну, обычно палкі берут ужэ, тыя постаўляць коло хаты, а палку беруць ідуць, і вжэ гэтыя палкі кідаюць всі в воду...»*[15]. Звычай провадаў (выгнання) зімы на Фаміным тыдні складае рэгіянальную спецыфіку Брэстчыны [21, с. 124]. У прыведзеным апісанні выгнання зімы на Фаміным тыдні бачым дзеянні, характэрныя для святкавання Масленіцы на Палессі (спальванне пудзіла і старых рэчаў), але замацаваныя за іншым абрадавым часам.

У вёсцы Перарова Млынок Жыткавіцкага р-на зафіксаваны перанос на Праводную нядзелю Масленічнага звычаю прасіць адно ў аднаго даравання [8, с. 210–211]. Звесткі пра такі ж перанос, толькі на Вялікдзень, запісаны і ў вёсцы Неглюбка Веткаўскага р-на [8, с. 211]. У Добрушскім р-не зафіксавана ўяўленне, што на Масленіцу *"зіма з летам сустракаюцца"*[16] [9, с. 220], хаця звычайна так кажуць пра Стрэчанне. Усё гэта сведчыць пра "расцягванне" вясновага навалецця і магчымасць прымеркавання такога яго элемента, як провады зімы, да розных свят.

---

[10] Зап. С. Г. Выскварка ў 2000 г. у в. Обчын Любанскага р-на Мінскай вобл. ад Галай Зоні Нічыпараўны, 1932 г. н.

[11] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. у пас. Крупскі Крупскага р-на Мінскай вобл. ад Касінскай (дзяв. Бжэзіцка) Антаніны Адамаўны, 1941 г. н., нар. у в. Сярэднія Печы Лельчыцкага р-на, з 1949 г. у в. Свіднае Лельчыцкага р-на, у Крупскім з 2004 г.

[12] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2015 г. у в. Чыжаха Бярэзінскага р-на ад культработніцы Карканіцы (дзяв. Пікарэвіч) Кацярыны Уладзіміраўны, 1957 г. н., нар. у в. Прыцерпа Бярэзінскага р-на, у Чыжасе жыве з 1984 г.

[13] Зап. у в. Моталь Іванаўскага р-на ад Анастасіі Мінько, 1935 г.н.

[14] Зап. у в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на ад Е. В. Глушаковай, А. К. Ермаковай, В. І. Фяськовай, П. М. Мельнікавай, Г. Е. Судненкі.

[15] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2015 г. у в. Перасудавічы Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. ад Мікуліч Надзеі Васільеўны, 1942 г. н., правасл., нар. у в. Здзітава Бярозаўскага р-на.

[16] Зап. студэнтка Гомельскага педуніверсітэта А. Стальмахова ў 2000 г. у в. Кругавец Добрушскага р-на ад Кабанчук Святланы Мікалаеўны, 1938 г. н. (перасяленка з в. Астрагляды Брагінскага р-на).

Такім чынам, выгнанне зімы на Палессі магло прымяркоўвацца да перыяду ад Стрэчання да Фаміна тыдня і ўвасабляцца выдаленнем (выкіданнем, спальваннем) за межы "сваёй" прасторы ўвасаблення "старога" сезона: пудзіла, старызны. Тэндэнцыю старых рэчаў, што спальваліся на Масленіцу, набываць рытуальны сэнс і станавіцца сімвалам свята адзначае А. К. Байбурын [3, с. 138–144]. Ён звяртае ўвагу на старое адзенне масленічнага пудзіла, мяркуючы, што яно сімвалізуе старасць, зношанасць свету, які аднаўляецца ў масленічным рытуале [3, с. 132–133]. На Рускай Поўначы ў апошні дзень Масленіцы ці ў першы панядзелак Вялікага посту маглі спаліць пудзіла, старыя рэчы ці проста раскласці вогнішча, што звалася "жегчи масленицу". І. А. Марозаў і І. С. Сляпцова робяць выснову, што "адна з мэт масленічнага вогнішча – пазбаўленне ад старога хламу, што адслужыў сваё і стаў шкодным", зазначаюць таксама, што "перыяд канца Масленіцы і пачатку Вялікага посту… ва ўсіх народаў Еўропы, у т. л. у рускіх, быў звязаны з абрадамі і звычаямі ачышчэння" [4, с. 294, 809, 818].

Гуканне вясны. Пачатак спявання вяснянак вызначаецца ў розных рэгіёнах Беларусі пэўнымі святамі (найчасцей Грамніцы, Масленіца, Саракі, Благавешчанне, сустракаецца – ад Аўдакеі, Аляксея, прысвяткаў, істотных у лакальнай традыцыі, а таксама з сярэдзіны Вялікага посту, Вялікадня, Ушэсця) ці прыроднымі з'явамі ("снег растаў", "як пойдзе лёд", "як трава на лугах зацвіце, лотаць на водзе", "як жаваранак прылятае") [23, с. 53; 17, с. 83, 87; 24, с. 94, 100; 21, с. 67, 103; 11, с. 122, 124; 8, с. 106–110]. Масленічнае гуканне вясны і спяванне вяснянак найбольш характэрнае для Палесся і памежных з ім раёнаў (мал. 2).

Гэта вёскі Дуброўнае і Новы пуць Брагінскага р-на [8, с. 161], Вялікі бор Хойніцкага р-на [10, с. 78], Губічы Буда-Кашалёўскага р-на[17] , Тонеж[18] , Букча і Дзяржынск [25, с. 112–114] Лельчыцкага р-на, Пагост, Новыя Мілевічы, Дзякавічы [8, с. 161–162], Буразь[19] , Азяраны [26, с. 10] і Хваенск [26, с. 40] Жыткавіцкага р-на, Багданаўка [21, с. 98] і Дзятлавічы[20] Лунінецкага р-на, Аснежыцы Пінскага р-на [21, с. 98], Дзяменічы Жабінкаўскага р-на [21] , Кустыні Астрамечава Брэсцкага р-на [27, с. 36], Обчын і Закальное Любанскага р-на [11, с. 121–122], Сякерычы Клецкага р-на[22] [28]. Гэта тлумачыцца кліматычнымі асаблівасцямі рэгіёна: тут цяплее раней, чым на астатняй тэрыторыі Беларусі.

Другі арэал спявання вяснянак на Масленіцу вылучаецца на Малым Палессі і ў Цэнтральнай Беларусі: вёскі Клінок Чэрвенскага р-на[23] [29], Раўкуцевічы Мінскага р-на[24], Ляшчыны Барысаўскага р-на[25], Стараселле Крупскага р-на [11, с. 122].

Гуканне вясны ў масленічных абрадах шчыльна звязана з провадамі зімы, што адрознівае яго ад гуканняў, прымеркаваных да іншых свят. Вяснянкі на Масленіцу часта выконваюцца пры вогнішчы, у якім паляць пудзіла ці старызну. Па звестках А. М. Доўнар-Запольскай, вясну гукалі ля масленічных вогнішчаў у Столінскім, Петрыкаўскім і Добрушскім р-нах. Звесткі, зафіксаваныя ў Добрушскім р-не, пацвярджаюць думку аб шчыльнай звязанасці гуканння вясны з провадамі зімы на Масленіцу: «*Казалі, што нада тут жа сразу, як згарыць, і Вясну клікаці, каб Зіма зноў не вярнулася*». А. М. Доўнар-Запольская тлумачыць гэта «боязню стварэння ў часе "пустых месцаў", магчымасці вяртання старога са знакам адмоўнасці часу» [30, с. 210]. Некалькі прыкладаў паказваюць на непадзельнасць завяршэння старога і сустрэчы новага перыяду ў свядомасці інфармантаў. У расповядзе з Жабінкаўскага р-на вясновая песня прыводзіцца ў структуры провадаў Масленіцы: *"На Масленіцу хто шо мае*

[17] Зап. Т. І. Кухаронак у в. Губічы Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. ад Пахомавай Ніны Назараўны, 1931 г. н., мясц., 3 кл., прав.

[18] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2014 г. у в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад групы жанчын.

[19] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. на фестывалі "Покліч Палесся" ў в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г. н., нар. і жыве ў в. Буразь Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

[20] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. на фестывалі "Покліч Палесся" ў в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. ад Алены Дзянісаўны Яскевіч, 1960 г. н. і Галіны Кузьмінічны Хартановіч, 1957 г. н., нар. і жывуць у в. Дзятлавічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.


[21] Зап. Т. В. Валодзіна ў 2004 г. у в. Дзяменічы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. ад Саванеўскай Веры Навумаўны, 1934 г. н.

[22] Зап. у в. Сякерычы Клецкага р-на ад Астахавай Вольгі Пятроўны, 1926 г. н.

[23] Зап. Т. І. Кухаронак у в. Клінок Чэрвенскага р-на ад Казачок Вольгі Аляксандраўны, 1932 г. н., мясц., 5 кл.

